штотыднёвая грамадска-асветніцкая газета

№ 9 (1605)

КУЛЬТУРА

4 сакавіка 2023

ТЭМА

Дабрыня, душа, радзіма. Шчыра пра актуальнае з Вольгай Няфёдавай

стар. 5

СУБОТНІЯ СУСТРЭЧЫ

“Будзьце каханымі, жаданымі, шчаслівымі!” Зорныя віншаванні ад Вікторыі Алешка

стар. 6

БЕЛАРУСЬ І СВЕТ

Каму патрэбен князь Мышкін, або Сам-насам з Іванай Жыган

стар. 8—9

КАРАНІ

“Гавару, як маці казала”. Пра бездакорны лінгвістычны густ і “клопат”

стар. 10

НАМ ПІШУЦЬ

Дзе шукаць крыніцу натхнення? Сакрэты аншлагаў — у народнай спадчыне

стар. 11

ВЯСНА, ЖАНЧЫНА, ТАЛЕНТ, БЭЗ

Водар вясны напаўняе паветра. Неўзабаве 8 Сакавіка. І расквецiцца той дзень буйствам цюльпанаў, руж, мімозы... Мы ж віншуем нашых беларусак галінкай шчамялёўскага бэзу. Мастак, пра якога зусім маладая гераіня нумара зняла фільм, праз творчасць пранёс памяць аб гэтым кветкавым сімвале пераможнай вясны 1945-га. Мастак на аркушы паперы ўдыхнуў жыццё ў бэз...

Працяг тэмы на стар. 7

Газета “Культура”

Індывідуальны
63875
Адзін месяц — 14,21 руб.
Тры месяцы — 42,63 руб.

Ведамасны
638752
Адзін месяц — 23,49 руб.
Тры месяцы — 70,47 руб.

Ільготны
(для юрыдычных асоб, афармленне падпіскі ў адрас супрацоўнікаў і пенсіянераў)
63879
Адзін месяц — 15,83 руб.
Тры месяцы — 47,49 руб.

Камплект: газета “Культура” і часопіс “Мастацтва”



Індывідуальны
63874
Адзін месяц — 29,87 руб.
Тры месяцы — 89,61 руб.

Ведамасны
638742
Адзін месяц — 54,89 руб.
Тры месяцы — 164,67 руб.

Часопіс “Мастацтва”

Індывідуальны
74958
Адзін месяц — 19,21 руб.
Тры месяцы — 57,63 руб.

Ведамасны
749582
Адзін месяц — 37,77 руб.
Тры месяцы — 113,31 руб.

Ільготны
(для юрыдычных асоб, афармленне падпіскі ў адрас супрацоўнікаў і пенсіянераў)
74986
Адзін месяц — 21,43 руб.
Тры месяцы — 64,29 руб.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Старшыня КНР Сі Цзіньпін

Усепагоднае і ўсебаковае партнёрства

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з 28 лютага да 2 сакавіка наведваў Кітай. Дзяржаўны візіт стаў працягам шматгадовага курсу на дружбу і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай.

У верасні мінулага года на двухбаковай сустрэчы падчас саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва лідары Беларусі і Кітая прынялі сумесную дэкларацыю аб выводзе адносін на новы ўзровень — усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства.Сёлета прадметам размовы кіраўнікоў дзяржаў стаў аналіз дасягнутага і максімальная рэалізацыя на практыцы патэнцыялу ў адносінах. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў афіцыйныя перагаворы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам і найвышэйшымі службовымі асобамі Кітая. Былі абмеркаваны пытанні далейшага супрацоўніцтва, напаўненне практычным зместам новага ўзроўню беларуска-кітайскіх стасункаў.

У цэнтры ўвагі — развіццё гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, рэалізацыя сумесных маштабных праектаў, узаемадзеянне ў палітычнай сферы, рэагаванне на найбольш вострыя выклікі ў сучаснай міжнароднай абстаноўцы.

Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін прынялі сумесную заяву аб далейшым развіцці ўзорных адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства Беларусі і КНР у новую эпоху. Па выніках перагавораў падпісаны вялікі пакет дакументаў па развіцці ўзаемадзеяння ў ключавых сферах. Беларусь і Кітай заключылі амаль чатыры дзясяткі пагадненняў і кантрактаў на $3,5 млрд. Дамовы датычацца развіцця супрацоўніцтва ў самых розных сферах, уключаючы інвестыцыі, сельскую гаспадарку, пастаўкі прадуктаў харчавання, ахову здароўя, будаўніцтва, прамысловасць, навуку і тэхніку, спорт, турызм і медыя.

Акрамя таго, падпісаны вялікі блок дакументаў па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, фінансах, банкаўскай сферы, інфармацыйным забеспячэнні гандлю і супрацоўніцтве па лініі Чырвонага Крыжа.

У рамках дзяржвізіту ў Кітай Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчы з кіраўніцтвам вядомых мясцовых карпарацый. Абмяркоўваліся інвестыцыі ў розныя сферы і супрацоўніцтва ў аўтамабілебудаванні.

Дарагія жанчыны!

У дзень светлага
і прыгожага вясновага
свята — 8 Сакавіка —
прыміце мае самыя
сардэчныя віншаванні!
Шчыра ўдзячны вам
за прафесіяналізм,
самааддачу і талент.
Ад усёй душы жадаю вам,
вашым родным і блізкім
здароўя, шчасця, кахання
і дабрабыту.
Няхай вам спрыяюць удача
і цудоўны настрой, радасць
і невычэрпная вера
ў будучыню, а прыгажосць
і абаяльнасць застаюцца
заўсёды з вамі.
Міру, дабра і натхнення,
шаноўныя калегі!

Міністр культуры
А. М. Маркевіч

Перспектывы супрацоўніцтва

У рамках рабочага візіту дэлегацыі Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі 3 сакавіка прайшла сустрэча міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з намеснікам міністра культуры Расійскай Федэрацыі Алай Манілавай. Падчас сустрэчы былі абмеркаваны пытанні двухбаковага супрацоўніцтва і вызначаны задачы на найбліжэйшую перспектыву. На перамовах прысутнічаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Барыс Грызлоў.



Былі ўдакладнены планы ўзаемадзеяння ведамстваў дзвюх краін па праграме 2023 года. Ала Манілава нагадала, што ў 2019-м кіраўнікі Беларусі і Расіі дамовіліся аб стварэнні трохгадовай міжведамаснай праграмы супрацоўніцтва з пералікам канкрэтных мерапрыемстваў і тэрмінаў рэалізацыі. Праграма штогод удакладняецца і дапаўняецца новымі пазіцыямі.

Вялікае значэнне маюць мерапрыемствы, якія ладзяцца не толькі непасрэдна міністэрствамі, але і падведамаснымі ім установамі — тэатрамі, музеямі, бібліятэкамі, творчымі калектывамі. Таксама каардынуецца культурнае супрацоўніцтва рэгіёнаў Беларусі і Расіі і стымулюючца гарызантальныя сувязі.

На сустрэчы разглядаліся і планы правядзення ў Мінску першага расійска-беларускага музейнага форуму, які мусіць адбыцца ўжо сёлета ўвесну і аб'яднаць прадстаўнікоў не толькі агульнанацыянальных, але і рэгіянальных музеяў абедзвюх краін. Акрамя таго, уздымаліся пытанні збліжэння заканадаўчых баз у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Бакі дамовіліся, што арганізуюць у 2023-м сумесную калегію міністэрстваў культуры Беларусі і Расіі ўвосень у Брэсце, а таксама Дні духоўнай культуры Расіі, Дні расійскага кіно і іншыя мерапрыемствы.

Акрамя таго, Анатолій Маркевіч і Ала Манілава гаварылі пра пашырэнне гастрольнай і канцэртнай дзейнасці творчых калектываў дзвюх краін, удзел беларускіх артыстаў у буйных расійскіх праектах, развіццё супрацоўніцтва ў бібліятэчнай і музейнай сферах, фінансаванне Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" і рэспубліканскага свята "Александрыя збірае сяброў".

Рэспубліканскі семінар-практыкум "Маркетынг ва ўстановах культуры: праблемы прасоўвання платных паслуг" прайшоў з 28 лютага па 1 сакавіка на Віцебшчыне.

На карысць справе

Установы культуры Аршанскага раёна гасцінна адчынілі дзверы для ўдзельнікаў семінара. Гэта дырэктары абласных метадычных цэнтраў, начальнікі аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райгарвыканкамаў, а таксама дырэктары і спецыялісты ўстаноў культуры.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, Упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама.

Падчас падзеі адмыслоўцы падзяліліся вопытам работы па развіцці пазабюджэтнай дзейнасці, абмеркавалі пытанні маркетынгавых тэхналогій.

Установы Аршаншчыны абʼёмна прэзентавалі лакальную традыцыйную культуру. Дасягненні прадэманстравалі гарадскі Цэнтр культуры "Перамога", раённы Цэнтр культуры, Аршанская ЦБС, Дом рамёстваў, Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны і яго філіял "Этнаграфічны музей «Млын»", гарадскі дзіцячы парк "Казачная краіна", а таксама Цэнтр народнай творчасці і рамёстваў, Дом культуры г. п. Балбасава, Палац культуры г. Барань.

Тым часам на Віцебшчыне праходзіў троядзённы навучальны семінар па актуальных пытаннях развіцця сферы культуры для кіраўнікоў структурных падраздзяленняў аблвыканкамаў, райгарвыканкамаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры Віцебскай і Гродзенскай абласцей.

У семінары паўдзельнічалі прадстаўнікі Міністэрства культуры: намеснік міністра Сяргей Саракач, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Ірына Карповіч, начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Марына Юркевіч, начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Іна Адамовіч. Прысутнічалі і супрацоўнікі праваахоўных органаў, установ адукацыі, прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму.

Праграма навучальнага курса была распрацавана Міністэрствам культуры сумесна з Беларускім прафесійным саюзам работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму.

Вызначэнне найлепшых

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 1 сакавіка. Дзякуючы сродкам відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Аднаўляецца традыцыя правядзення нацыянальнага конкурсу "Песня года", які ладзіцца супольна з тэлеканалам "АНТ". Гала-канцэрт пройдзе 8 сакавіка ў сталічным Палацы спорту і будзе трансліравацца па тэлебачанні. Імпрэза аб'яднае як маладых, так і знакамітых выканаўцаў. Публіка зможа пабачыць выступленні Вікторыі Алешка, Алёны Ланской, Ірыны Дарафеевай, Германа, Тэа і Вольгі Рыжыкавай, Аляксандры Гайдук, гурта "Аўра" і арт-групы "Беларусы". Акрамя таго, на вялікай сцэне выступяць фіналісты праектаў "Фактар.by" і "Зорны шлях". Завершыць музычнае шоу выступленне Руслана Аляхно.

Фінал Нацыянальнага конкурсу прыгажосці "Міс Беларусь", арганізатарамі якога выступаюць Міністэрства культуры, тэлеканал "АНТ" і Нацыянальная школа прыгажосці, мусіць адбыцца 8 верасня. Сёння праходзяць адборы кандыдатак на месцах, ужо вызначаныя даты абласных адборачных тураў.

Колькі каштуе музейны прадмет?

Семінар пры Міністэрстве культуры "Улік і ацэнка ў складзе нацыянальнага багацця музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь" прайшоў у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы 28 лютага з удзелам галоўных захавальнікаў абласных і рэспубліканскіх музеяў.

Як распавяла кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Надзея Аўдзей, загад і метадычныя рэкамендацыі па ацэнцы прадметаў былі накіраваны ў музейныя ўстановы ў кастрычніку мінулага года. Справаздачы па ўліку музейных прадметаў мусяць утрымліваць звесткі аб колькасці прадметаў асноўнага фонду на 1 студзеня, колькасці прадметаў, набытых у справаздачным годзе, колькасці прадметаў асноўнага фонду, выніковай велічыні кошту прадметаў асноўнага фонду і колькасці неацэненых прадметаў асноўнага фонду.

Так, у Нацыянальным гістарычным музеі праведзена ацэнка калекцыі вырабаў са шкла, якая налічвае каля 3560 прадметаў. Спісы збору пачалі рыхтаваць у 1960-х гадах па выніках экспедыцый на шклозаводы ў Барысаве і Бярозаўцы. Для ацэнкі быў выпрацаваны каэфіцыент, што дазволіў высветліць кошт прадметаў у параўнанні з закупачнымі цэнамі, па якіх элементы набываліся ў ранейшыя гады, без уліку гістарычнай і мастацкай каштоўнасці. Каб прыняць пад увагу ўсе крытэрыі, даводзілася звяртацца да экспертаў-ацэншчыкаў Дзяржаўнага мытнага камітэта.

На вартасць прадметаў могуць уплываць таксама ўзрост, належнасць тым ці іншым гістарычным асобам, мемарыяльнае значэнне. Удзельнікі семінара выказалі меркаванне, што мусіць быць выпрацаваны адзіны ўніфікаваны падыход да ацэнкі музейных прадметаў, які дазволіць забяспечыць аднастайнасць у прынцыпах арганізацыі работы ў гэтым напрамку.

Страта

ДУДАРАЎ Аляксей Ануфрыевіч

27 лютага 2023-га на 73 годзе жыцця памёр вядомы айчынны драматург — заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Дударaў Аляксей Ануфрыевіч.

Дударaў Аляксей Ануфрыевіч нарадзіўся 6 чэрвеня 1950 года ў вёсцы Кляны Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Праходзіў падрыхтоўку ў Наваполацкім прафесійна-тэхнічным вучылішчы нафтавікоў, некаторы час працаваў на заводзе.

У 1976-м скончыў тэатральны факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. У тым жа годзе быў запрошаны ў Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача і з 1978-га па 1983-і кіраваў літаратурнай часткай установы. З 1991 па 2002 год Аляксей Дударaў з'яўляўся галоўным рэдактарам часопіса "Мастацтва", у 2001-м стаў мастацкім кіраўніком тэатра-студыі "Вольная сцэна" пры Саюзе тэатральных дзеячаў Беларусі, з 2003 па 2013 год быў мастацкім кіраўніком Драматычнага тэатра Беларускай арміі. З 1992-га ўзначальваў Беларускі саюз тэатральных дзеячаў.

Літаратурнай дзейнасцю Аляксей Дударaў пачаў займацца падчас працы ў Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача.

Значнае месца ў творчасці драматурга займае тэма Вялікай Айчыннай вайны. Сапраўднай падзеяй у тэатральным жыцці другой паловы 1980-х стала п'еса "Радавыя", у якой пісьменнік узняў пытанне, чым была вайна для кожнага яе шараговага ўдзельніка. Твор у 1984 годзе адзначылі прэміяй Ленінскага камсамола, а ў 1985-м — Дзяржаўнай прэміяй СССР.

Да тэмы Вялікай Айчыннай вайны Дударaў вяртаўся і ў пачатку XXI веку. Да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ён напісаў п'есу "Ты памятаеш, Алёша...", прысвечаную абароне Магілёва ў першыя дні вайны. Спектакль быў пастаўлены ў Драматычным тэатры Беларускай арміі. За напісаны па п'есе сцэнарый фільма "Дняпроўскі рубеж" (2009) драматург удастоіўся прэміі за найлепшы сцэнарый мастацкага фільма на конкурсе, абвешчаным кінастудыяй "Беларусьфільм". Прыкметны ўклад у распрацоўку ваеннай тэматыкі ўнесла і п'еса Аляксея Дударава "Не пакідай мяне..." (2005).

На працягу ўсёй творчай дзейнасці Аляксей Дударaў выяўляў цікавасць да мінулага Беларусі. Яркія характары і вобразы гістарычных асоб адлюстраваны ў п'есах "Князь Вітаўт" (1997), "Чорная панна Нясвіжа" (1998), "Палачаніка" (2000), "Крыж" (2000), "Усяслаў Чарадзей" (2001). За напісанне гістарычных п'ес, пастаўленых на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, у 2001 годзе Аляксею Дудараву была прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Беларусі.

Па сцэнарыях Дударава зняты 16 фільмаў, у тым ліку знакамітыя "Белыя Росы" (1983), "Восеньскія сны" (1987), "Брэсцкая крэпасць" (2010, у складзе калектыву аўтараў). У 2002 годзе за сцэнарый фільма "Белыя Росы", а таксама за п'есы "Парог", "Вечар", "Радавыя", "У прыцемках", "Чорная панна Нясвіжа" пісьменнік атрымаў прэмію Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў галіне літаратуры і мастацтва. У 2014-м па п'есе Дударава быў створаны фільм "Белыя Росы. Вяртанне".

Аляксей Ануфрыевіч Дударaў унёс неацэнны асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю беларускага тэатральнага і кінематаграфічнага мастацтва.

Выдатны драматург, грамадскі дзеяч, чалавек велізарнай душы назаўсёды застанецца ў памяці родных, блізкіх, сяброў, калег і шматлікіх гледачоў.

Петрышэнка І. В., Маркевіч А. М., Анісімаў А. М., Елізар'еў В. М., Яфрэмаў А. В., Зубкова З. П., Міронава Т. В., Аўсяннікаў Г. С., Герасімовіч Э. І., Кавальчык С. М., Козак А. А., Сухавей С. І.

Развітальныя словы

ГЕНАДЗЬ ДАВЫДЗЬКА, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, дзяржаўны і палітычны дзеяч, акцёр, тэлевядучы:

— Аляксей Ануфрыевіч (я яму і пры жыцці гэта гаварыў) з'яўляўся вельмі светлым чалавекам, якому не былі ўласцівыя зайздрасць, нездаровае саперніцтва, жаданне штосьці камусьці даказаць. Усе яго творы — гэта трыумф святасці, чалавечнасці. Сведчанне таго — хаця б такі сюжэтны ход драматурга: хлопца запрашаюць у масоўку сыграць нямецкага салдата, але ён не можа, згодна са сцэнарыем, кінуць бохан хлеба на зямлю. У гэтым — увесь Дударaў. Творца быў дасланы нябёсамі з вялікай місіяй — ушанаваць нашу гістарычную памяць, прааналізаваць шлях пакут і набыткаў беларускага народа і, вядома, абудзіць у людзях іх найлепшыя якасці. Звярніце ўвагу: майстар памёр у першы дзень Вялікага посту, а 40 дзён са смерці прыпадуць на Вялікдзень з усёй яго сакральнасцю ўваскрэсення. Ці ж гэта не сімвалічна? Бо ідэі праваслаўя можна знайсці нават у п'есе "Парог", дзе ў цэнтры — непрабудны п'яніца. І гэта ў савецкія часы з іх імкненнем да станоўчых герояў, на якіх трэба раўняцца! Але ж зірніце з іншага боку: Буслай не хто іншы, як грэшнік, што каецца і тым самым атрымлівае прабачэнне. І так — літаральна ў кожнай п'есе.

Творчасць Дударава я паставіў бы побач з драматургіяй Андрэя Макаёнка і паэзіяй Янкі Купалы. Нам яшчэ патрэбен час, каб напоўніцу асэнсаваць усё, што было зроблена Аляксеем Ануфрыевічам. П'есы пісаць нашмат складаней, чым прозу, дзе можна дакладна акрэсліць, што герой падумаў у той ці іншы момант, якія эмоцыі перажыў. У драматургіі ж гэта магчыма абазначыць хіба сцісламі рэмаркамі. Яна — бы айсберг, дзе бачна адно вяршыню, астатняе ж схавана ў падтэксце кожнага слова, які трэба добра прадумаць. Згадаю такі эпізод. "Радавыя" ствараліся непасрэдна ў тэатры, разам з рэжысёрам Валерыем Раеўскім і артыстамі. Дударaў прысутнічаў на ўсіх рэпетыцыях, мы маглі падысці да яго і сказаць, маўляў, вось тут мне хацелася б таго — па просьбе майстар дапісаў маналог майго героя. Але ж была ў тэксце дэталь: Бушцец тушыць недакурак аб далонь. Каб выканаць тое праўдзіва, патрабаваўся ледзь не акцёрскі трук, бо я ў гэты момант знаходзіўся на авансцэне. Пасля Дударaў неяк кажа: "Добра ты гэта прыдумаў!" — "Што прыдумаў? Усё ж у п'есе было". Паспрачаліся на бутэльку каньяку, хтосьці з відавочнай нават хуценька ў краму збегаў, каб усё атрымалася без падману. Прынеслі п'есу (яна на той час ужо з друку выйшла) — і Дударaў вачам не мог паверыць, што гэта не рэжысёрская знаходка, а яго ўласная, насамрэч вельмі важная для разумення псіхалагічнага стану героя. Хаця чаму здзіўляцца? Творца папраўдзе прыроджаны драматург — ад Бога. Мне распавядалі, што яшчэ ў часы вучобы на акцёрскім Дударaў лепш за ўсіх прыдумляў эшоды, кожная такая імправізацыя станавілася маленькім аповедам — адметным і вельмі цікавым. Пазней гэты талент развіўся — і вырас вялікі драматург.

Працяг успамінаў пра Аляксея Дударава на стар. 14—15

Абрад "Чырачка"

Адчуць "смак" краіны

Чым рэгіёны прываблiваюць турыстаў?

Неўзабаве распачнецца новы турыстычны сезон. Куды з'ездзіць, што паглядзець, дзе адпачыць? Каляндар падзей і актуальныя маршруты па Беларусі презентавалі адмыслоўцы на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Прэс-канферэнцыя, прысвечаная новаму турыстычнаму сезону, пачалася з падвядзення вынікаў развіцця турызму за мінулы год. Намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме, начальнік аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь **Кацярына Нікіціна** распавяла, што колькасць арганізаваных турыстаў і экскурсантаў-грамадзян Беларусі летась склала прыблізна 1 млн 330 тыс. чалавек. Таксама нашу краіну наведалі 1 млн 400 замежных турыстаў. Агулам колькасць турыстаў у 2022 годзе ў параўнанні з 2021-м вырасла ў паўтара раза.

Мінулы год прайшоў пад знакам паляпшэння турыстычнага заканадаўства ў адпаведнасці з новым Законам "Аб турызме" і Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб развіцці агразкатурызму". На 2023 год запланавана стварэнне сеткі турыстычных інфармацыйных цэнтраў. Яшчэ на сайце Нацыянальнага агенцтва па турызме даступны рэестр экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, які дазваляе падарожнікам хутка падабраць спецыяліста з адпаведнай падрыхтоўкай. Летась у краіне атэставалі 190 экскурсаводаў.

Косаўскі палацава-паркавы комплекс

Палацава-паркавы ансамбль Булгакаў у Жылічах

Начальнік аддзела якасці і вучэбна-аналітычнай работы Нацыянальнага агенцтва па турызме **Ганна Вашчынчук** адзначыла, што на інтэрнэт-партале арганізацыі змешчаны каляндар падзей на 2023 год, складзены ў тым ліку з удзелам Міністэрства культуры, дзе сабраны звесткі пра мерапрыемствы, якія могуць зацікавіць вандроўнікаў. Сярод іншага там прадстаўлены падзеі, звязаныя з традыцыйнымі абрадамі і нематэрыяльнай культурай. Цягам месяца мусяць пабачыць свет метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі экалагічных экскурсій, а таксама вынікі маркетынгавага даследавання па архітэктурных ансамблях і палацава-паркавых комплексах Беларусі.

Намеснік генеральнага дырэктара інфармацыйнага агенцтва "Мінская праўда" **Наталля Царыкевіч** распавяла аб кнізе "Міншчына гасцінная", выхад якой прымеркаваны да 85-годдзя ўтварэння Мінскай вобласці. Выданне ўтрымлівае інфармацыю аб найпапулярнейшых турыстычных аб'ектах рэгіёна. З дапамогай QR-кодаў, надрукаваных у кнізе, чытач можа даведацца больш пра турыстычны патэнцыял кожнага краю на сайтах раённых выканаўчых камітэтаў.

МАРШРУТ ПАБУДАВАНЫ... НЕЙРАСЕТКАЙ

Начальнік аддзела турызму Упраўлення спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама **Алена Космач** звярнула ўвагу, што ў рэгіёне актыўна развіваецца ваенна-гістарычны турызм, рэканструкцыі падзей Вялікай Айчыннай вайны ладзяцца ў Брэсцкай крэпасці і ў мемарыяльным комплексе партызанскай славы ў Хаваншчыне Івацэвіцкага раёна. Значным аб'ектам зрабіўся і Косаўскі палацава-паркавы комплекс XIX стагоддзя, які адчыніў дзверы для наведвальнікаў у снежні мінулага года.

Кіраўнік турыстычнага праекта "Спазнай Кобрын" **Віктар Лагвіновіч** расказаў аб перспектывах выкарыстання нейрасетак у сферы турызму. У рамках платформы Planet Guide распрацоўваюцца ўласныя нейрасеткі Color Pixel і Go Travel. Першая дазваляе рэстаўраваць старыя чорна-белыя здымкі, паляпшаць якасць і пераводзіць іх у колер. Старыя фота, ажыўленыя такім чынам, актыўна выкарыстоўваюцца на экскурсіях і дапамагаюць падарожнікам лепш уявіць, як выглядалі тыя ці іншыя мясціны ў мінулым. Сетка Go Travel, у сваю чаргу, дазваляе праводзіць аўтаматычны аналіз турыстычных мясцін і вызначаць прыярытэтныя напрамкі для арганізацыі экскурсій.

Загадчык сектара турызму і фізкультурна-аздараўленчай работы Віцебскага аблвыканкама **Святлана Астаніна** падкрэсліла, што ў рэгіёне распрацаваныя тры туры выхаднога дня: "Праз прызму дзесяцігоддзяў" пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, "Новы погляд на крокі гісторыі", прысвечаны гістарычным славутасцям рэгіёна і яго выдатным асобам, і "Крокі гісторыі праз сучаснасць", арыентаваны на дзяцей і моладзь, які заахвоціць іх да вывучэння гісторыі, культуры і эканомікі вобласці.

СПАДЧЫНА ЖЫВАЯ І АДРОДЖАНАЯ

Загадчык сектара турызму Упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама **Ігар Назарчук** распавёў пра традыцыі, якімі знакамітае Палессе. Да прыкладу, 16 лютага на Лоеўшчыне адзначылі Стрэчанне, што прыцягнула багата публікі, у тым ліку і з моладзі. А 26 лютага ў Тонежы Лельчыцкага раёна прайшоў абрад заклікання вясны "Чырачка". На 16 мая запланаваны вясновы абрад "Юраўскі карагод" у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна, на 21 мая — свята "Мядовы фальварак" у Сіманавічах Лельчыцкага раёна, на 25-га — абрады "Ваджэнне і пахаванне стралы" ў Веткаўскім раёне і "Провады русалкі" ў Вялікім Бары на Хойніччыне. Дарэчы, летась распрацавалі мабільны дадатак GOmel travel, які дапаможа турыстам сарыентавацца ў славутасцях Гомельшчыны і пабудаваць маршрут па іх.

Намеснік начальніка Упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама **Таццяна Лідзяева** паведаміла, што распрацоўваецца агульнаабласны маршрут па колішніх яўрэйскіх мястэчках-штэтлах з усталяваннем інфармацыйных шыльд і стэндаў. У маі запланавана адкрыццё Палацава-паркавага комплексу Валовічаў другой паловы XVIII — пачатку XIX стагоддзя ў Свяцку Гродзенскага раёна. Акрамя таго, у 2022-м на Гродзеншчыне працягвалася рэстаўрацыя Гальшанскага, Крэўскага, Навагрудскага замкаў, Старога замка, брыгіцкага манастыра і колішняга палаца Агінскіх у абласным цэнтры, сядзібы Агінскіх у Залессі Смаргонскага раёна і царквы ў Мураванцы Шчучынскага раёна.

АД СПОРТУ ДА КУЛІНАРЫІ

Дырэктар дзяржаўнага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства "Магілёўаблтурыст" **Алена Карпенка** распавяла пра маршрут "Уздоўж вялікага шляху", прызначаны для сплаву на байдарках альбо плытах па Дняпры і яго прытоках. Дарога ляжыць праз Магілёў, Шклоў і Бялынічы. У Мсціславе яшчэ адзін новы турыстычны маршрут дазволіць пазнаёміцца з яўрэйскай спадчынай раённага цэнтра, а ў Слаўгарадскім раёне можна паўдзельнічаць у майстар-класах па бортніцтве і прыгатаванні сыроў. Адмысловы маршрут, які ахоплівае Магілёў, Шклоў, Слаўгарад і Крычаў, прысвечаны эпосе Кацярыны II, ролі імператрыцы ў гісторыі ўсходняга рэгіёна.

Сапраўднай турыстычнай перлінай Магілёўшчыны мусіць зрабіцца Палацава-паркавы ансамбль Булгакаў у Жылічах, адкрыццё якога пасля рэстаўрацыі запланавана на красавік. У самім жа абласным цэнтры ладзяцца экскурсіі, прысвечаныя гарадскім легендам, гастранамічнай спадчыне, алімпійскаму руху і савецкаму перыяду гісторыі Магілёва, калі населены пункт ледзь не зрабіўся сталіцай БССР. Акрамя таго, падарожнікі могуць завітаць на экскурсію ў драматычны тэатр, на мясцовы вінзавод, дзе праводзіцца дэгустацыя налівак, на майстар-класы па прыгатаванні нацыянальных страў у Беларускім дзяржаўным універсітэце харчовых і хімічных тэхналогій.

Антон РУДАК

Пра здабыткі, праблемы і перспектывы галоўнай драматычнай сцэны краіны — Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы — пагаворым з яго мастацкім кіраўніком, заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Вольгай Няфёдавай.

"Мы акрыялі, не здаліся..."

— Нам па-ранейшаму не стае акцёраў, аднак магу сказаць: Купалаўскі тэатр ніколі не працаваў так шчыльна, так насычана, так ярка. Мы выпускаем па 4—5 спектакляў на год, што было рэдкасцю нават пры цалкам сфарміраванай трупе. Усё гэта дзеля шаноўных гледачоў. Мы жывыя: акрыялі, не здаліся, не паддаліся на ўсялякія правакацыі. І нас нішто не зломіць, нішто не перашкодзіць нам казаць з вялікай сцэны пра сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці, спектаклямі выхоўваць у моладзі правільнае стаўленне да старэйшага пакалення, да радзімы, да жыцця.

Місія любога тэатра, а нацыянальнага тым больш, — несці нацыянальную культуру, выхоўваць асобу згодна з духам часу і курсам дзяржавы. Сваёй творчасцю мы гаворым пра сапраўдныя каштоўнасці — душу, радзіму, патрыятызм, дабрыню — і пра тое, як быць чалавекам, нягледзячы на складаныя перыпетыі ва ўсім свеце.

Мы ідзём поруч з Міністэрствам культуры, якое дапамагае ва ўсіх пытаннях. Па 30-гадовым вопыце працы ў Купалаўскім тэатры магу сказаць, што цяпер, напэўна, упершыню міністр і ўсё ведамства з такой увагай адносяцца да ўстановы: нас чуюць і бачаць, прыходзяць да нас. І мы вырашаем значную колькасць складаных пытанняў, якія ўзнікаюць цягам рэпетыцый і падчас працы ўвогуле.

У нас яркая, бурная гастрольная дзейнасць. Мы ездзім па гарадах Беларусі, і паўсюль нас прымаюць на "ўра", не адпускаюць. Прыходзяць заяўкі — і мы вяртаемся ў тыя месцы, дзе ўжо бывалі. Гэта паказвае, што людзі засумавалі па сапраўдных каштоўнасцях. Народ ашалеў ад патоку негатыўнай інфармацыі, а душа ж прагне шчырага і светлага!

Што да фарміравання трупы, адчуваем патрэбу ў артыстах ад 30 да 60 гадоў. Асноўныя дзейныя асобы ўсёй сусветнай драматургіі належаць менавіта да названага пакалення. Мы збіраем калектыў пакрысе, і для таго неабходна шмат часу — каб у тэатры былі найлепшыя як па таленце, так і па душэўных якасцях. Гэта абавязкова, як паказаў 2020-ы. Самае важнае патрабаванне да кандыдатаў — талент, бо Купалаўскі тэатр заўсёды (і 100 гадоў таму, і цяпер) выручаецца прафесійным акцёрскім складам. Яшчэ адзін важны крытэрый пры адборы ў трупу — душэўныя якасці, што адпавядаюць гордаму імені Чалавек. Подлых і злосных людзей сцэна не прымае, адштурхоўвае. Таксама мы карыстаемся дапамогай акцёраў з іншых труп, якія з'яўляюцца патрыётамі і сапраўды любяць тэатр.

Наконт маладога пакалення магу сказаць, што яму не хапае нармальных ведаў. Гэта біч нашага грамадства. І прывяла да такой сітуацыі вялікая бяда — інтэрнэт. Павярхоўнае чытанне, выхопліванне звестак з рэсурсаў сусветнага павуціння зрабілі сваю згубную справу. Цэлыя пакаленні, на сорам і жах, адышлі ад чытання. А ты не будзеш акцёрам, калі не чытаеш, калі не развіваеш фантазію і чалавечыя якасці. Маладым не стае агульнай эрудыцыі і ўсведамлення маральных каштоўнасцей. Адсюль неразуменне, што такое радзіма, як варта ставіцца да старэйшага пакалення, якімі мусяць быць адносіны да тых, хто цябе выхоўвае.

Мы працуем з рознымі пастаноўшчыкамі. Няма такога рэжысёра, які выдатна можа зрабіць і камедыю, і трагедыю, і трагікамедыю, і меладраму. Гэта сведчыць, што тэатр мусіць складацца з розных рэжысёраў. Такім чынам ён развіваецца, а не стаіць на месцы і буксуе. Да прыкладу, у Валянціны Ераньковай зусім іншая эстэтыка, хутчэй эстэтыка Рускага тэатра. Але менавіта таму мы папрасілі творцу зрабіць пастаноўку паводле Астроўскага. Я не скажу, што гэта сапраўды купалаўскі спектакль, але ён мае права на жыццё. Астроўскі ў сённяшнім свеце можа быць такім. Гэта цікавы эксперымент. Цяпер вядзём перамовы з трыма моцнымі рэжысёрамі. І, дай бог, у нас усё атрымаецца, з'явяцца новыя спектаклі. Тэатр будзе жыць абавязкова!

Шура ДАНІЛОВІЧ

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Людзі заўважаюць...

Сучаснае беларускае мастацтва — цэльная дынамічная з'ява, што рухаецца па ўласных законах. Якія шляхі развіцця найбольш паспяховыя? Якія праблемы існуюць? Адказы на пытанні шукаюць нашы чытачы.

АЛЕНА, фармацэўт

— Сучаснае беларускае мастацтва — нешта загадкавае. Сцвярджаюць, быццам яго ўвогуле няма. Але ж ёсць маладыя творцы! Тады чаму рэдка можна пачуць іх імёны ці даведацца пра іх выставы? У музеях дэманструюць работы сталых айчынных жывапісцаў, а дзе карціны маладых? Востра адчуваецца і грашовае пытанне. А есці ж хочацца. Кажуць, калі ты не зарабіў імя, у галерэю не сунься. Магчыма, праблема ў таленце... Некаторыя мяркуюць, што ў Беларусі не хапае арт-пляцовак.

Дык што рабіць, каб грамадкасць заўважыла сучаснае беларускае мастацтва? Належыць яго папулярызаваць, яно павінна выйсці з поцемкаў галерэй, даступных вузкаму колу культурнай эліты, і не хавацца ў майстэрнях. Бо канкурэнцыя нараджае запатрабаванасць. Бо мастацтва не толькі тое, што закансервавана ў музеях. Яшчэ яно натхняе мінакоў, упрыгожвае навакольны свет, закранае важныя сацыяльныя праблемы.

ТАЦЦЯНА, юрыст

— Сёння не стае яркіх імёнаў у беларускай літаратуры. Караткевіч, Шамякін, Колас... Такіх глыб зараз няма. Ці проста пра іх не гаворыць? Сучасная моладзь не купляе кнігі: у вольным доступе алічбаваная літаратура усяго свету. Навошта набываць папяровыя выданні? Бяднейшымі становяцца хатнія бібліятэкі. Хаця нельга сказаць, што грамадская цікавасць да чытання знікае. Хутчэй, наадварот. Мы жывём у стагоддзі, дзе пануе інфармацыя. Людзі праглядаюць за дзень тысячы сайтаў. Мы сталі больш разборлівымі, можам параўноўваць, абменьвацца меркаваннямі. Але ж гэта добра для беларускай літаратуры і наогул мастацтва. Чым? Тым, што, размяшчаючы свой твор у інтэрнэце, мы аддаём яго на адкрыты суд. І не трэба марнаваць грошы на паліграфію і тыражаванне.

Далей на аўтара працуе яго талент. Калі пісьменнік, мастак, музыкант сапраўды годны — яго заўважаць, ацэняць, палюбіць. А калі творца нічым не кранае чытачоў, гледачоў, то бессэнсоўна губляць час на прасоўванне яго кніг, палотнаў, канцэртаў.

ІЛОНА, адміністратар

— Мне падаюцца сумнеўнымі сцвярджэнні, што беларускае мастацтва дэградуе. Наадварот, пасля кароткага перыяду асэнсавання мы бачым ударны старт новага этапу, і далягляды вымалёўваюцца вельмі натхняльныя. Да прыкладу — Вялікі тэатр оперы і балета. Менавіта акадэмічнае мастацтва дэманструе найвышэйшую ступень майстэрства ў галіне вакалу і харэаграфіі.

Спектаклі, якія сёння ствараюцца, адрозніваюцца не толькі размахам і маляўнічасцю, але і стараннай распрацоўкай дэталей. Прыходзяць новыя асобы, артысты, што дэманструюць яркія, цікавыя магчымасці.

Эстрада таксама радуе. Па-першае, на тэлебачанні з'явіўся "Фактар.by". Моладзь прагнула славы ў сваёй краіне, і Белтэлерадыёкампанія з гэтым выклікам справілася. Маладым талентам далі зялёнае святло, і яны адчулі запатрабаванасць, смак поспеху. Па-другое, захоўваецца пераемнасць, калі вучні становяцца ў адзін шэраг з вядомымі артыстамі — вопытныя калегі гатовыя дзяліцца досведам з пачаткоўцамі. Ну а ў выйгрышы, як і павінна быць, аказваюцца гледачы, бо дзеля публікі ўсё і задумваецца.

Ганна САКАЛОВА

“З любоўю да музыкі і гледача — ваша Вікторыя Алешка”

Напярэдадні самага жаночага дня года мы пагутарылі з яркай прадстаўніцай беларускай эстрады, якая па праве можа лічыцца прыкладам для многіх маладых выканаўцаў. З Вікторыяй Алешка некаторыя нашы чытачы знаёмыя ледзь не з часоў, калі яна была салісткай легендарнага ансамбля “Верасы”. Зараз кожную пятніцу глядач сустракаецца са спявачкай на тэлеканале “Беларусь 1”, дзе Вікторыя ў складзе журы ўдзельнічае ў праекце “Фактар.by 60+”. Пра творчы шлях, натхненне і жыццёвыя прынцыпы расказвае заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь.

— Вікторыя Робертаўна, мо гэта і нечаканае пытанне, але якія парады вы сённяшняя далі б сабе ў мінулым?

— Цяжка дакладна адказаць... Усё ў маім лёсе адназначна складвалася так, як патрэбна. І нават падзеі, якіх не хацелася, неслі таемны сэнс, што адкрываўся праз некаторы час. А парады, на маю думку, — справа няўдзячная.

— Вы — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, уладальніца мноства ўзнагарод, у тым ліку медаля Францыска Скарыны. Якую адказнасць ускладае такі статус?

— Безумоўна, адчуваецца велізарная адказнасць, бо ты служыш узорам для артыстаў, якія толькі пачынаюць шлях. Таксама абавязаны падтрымліваць свой статус перад гледачом і пастаянна ўдасканальвацца ў прафесіі. Ва ўсякім разе, калі ты цалкам аддаешся любімай справе — гэта прыносіць толькі радасць.

— У 2022 годзе вы выступілі на сцэне каля 150 разоў, выпусцілі дзевяць новых песень і пяць відэакліпаў. Як атрымліваецца пазбягаць творчага выгарання і захоўваць высокую працаздольнасць?

— Вядома, я, як і кожны чалавек, стамляюся і ў пэўныя моманты не хачу нічым займацца. У такіх выпадках заўсёды ратуе магчымасць на нейкі час застацца ў адзіноце, ну а потым і пагутарыць з блізкімі людзьмі. Вельмі важную ролю іграе мая каманда, заўсёды гатовая падтрымаць. І, без сумневу, прыхільнікі: без іх мо і не было б матывацыі творча расці. Так што формула аднаўлення простая: некалькі дзён падобнай тэрапіі — і я ў згодзе з сабой.

— Вы працуеце на сцэне больш за 25 гадоў. Разам з вамі мяняўся і слухач. Які ён, ваш цяперашні прыхільнік?

— Найперш — гэта людзі, якія цэняць душэўную песню і ахвотна суперажываюць лірычнаму герою кожнай гісторыі, расказанай мной з дапамогай музыкі і тэкстаў таленавітых аўтараў.

— А ці закрадвалася калі-небудзь думка змяніць род дзейнасці?

— Калі пачалася пандэмія, мы, артысты, засталіся на доўгі час без працы. За гэтыя балючыя месяцы якія толькі думкі мяне не напаткалі. Тады я і зразумела: мо тое і кепска, але я нічым іншым не здолела б займацца. Таму кожны дзень дзякую Богу, што маё жыццё аддадзена любімай справе.

— Што вас натхняла на пачатку шляху і што дапамагае ствараць цяпер?

— І спачатку, і цяпер мной рухала толькі адно — любоў да музыкі і да слухача.

— Якія мелодыі ёсць у вашым плэй-лісце? Хто з выканаўцаў імпануе?

— Для мяне ў прынцыпе не вельмі важны жанр. Пры выбары музычнага матэрыялу кіруюся наступнымі крытэрыямі: павінна быць таленавіта, меладычна і якасна. А маім кумірам заўсёды застаецца Уітні Х’юстан.

— Нядаўна на экраны выйшаў тэлепраект “Фактар. by 60+”, дзе вы — адна з настаўніц. Якой бачыце сваю ролю ў шоу? У чым спецыфіка працы з артыстамі падобнага ўзросту?

— Гэты праект адрозніваецца тым, што мы не з’яўляемся настаўнікамі. Мы — члены журы, і наша задача — метадам адбору найлепшых выканаўцаў з эфіру ў эфір вызначыць аднаго пераможцу. Я не імкнулася кагосьці з удзельнікаў чамусьці навучыць ці засяродзіцца на іх памылках. Для мяне было важна звярнуць увагу на выбітныя якасці канкурсантаў, падказаць, чым выканаўцы вылучаюцца і падарыць веру ва ўласныя сілы. Бо гэтае шоу больш пра тое, што творчасці ніякі ўзрост не перашкода, а мары здзяйсняюцца: галоўнае — верыць і рабіць усё для іх ажыццяўлення.

— У вашых песнях часта сустракаецца вобраз жанчыны, што можа быць рознай: эмацыйнай, моцнай, загадкавай і незалежнай. Як бы вы апісалі жанчыну XXI стагоддзя?

— У пытанні і прагучаў адказ. Праўда ў тым, што сучасная прадстаўніца жаночага полу — увасабленне ўсіх стыхій, і ёй пад сілу здзейсніць усё задуманае. І, на мой погляд, гэта выдатна.

Бліц-апытанка да 8 Сакавіка

— Самы прыемны камплімент, які вам рабілі?
— Я люблю кампліменты, і таму яны ўсе самыя прыемныя.

— Найлепшы падарунак на 8 Сакавіка?
— Думаю, кожная з нас ацэніць увагу.

— З чаго, на вашу думку, складаецца жаночае шчасце?
— Для кожнай жанчыны яно сваё.

— Што б вы маглі пажадаць беларускам у гэтае свята?
— Дарагія нашы прыгажуні, будзьце каханымі, жаданымі і шчаслівымі заўсёды, а не толькі ў Міжнародны жаночы дзень!

— Нельга не адзначыць ваш прывабны знешні выгляд. Міжволі ўзнікае пытанне: як вы падтрымліваеце такую выдатную форму?

— Вельмі прыемна гэта чуць, але тут няма ніякіх асаблівых сакрэтаў прыгажосці. Вядома, у сукупнасці працуюць генетыка і самаўдасканаленне. Я імкнуся спаць не менш за восем-дзевяць гадзін, але тое індывідуальна, некаму і шасці досыць, галоўнае — адчуваць, што ты адпачыў. Фітнес, паходы да касметолага, правільнае харчаванне — гэтыя звычкі прынясуць толькі карысць і абавязкова будуць адзначаны тымі, каму я цікавая.

Настасся ЮРКЕВІЧ

Сёлета Беларускі саюз кампазітараў адзначае 90-годдзе. Урачыстасці супадаюць з XVIII з’ездам, які адбыўся 2 сакавіка. Сярод шматлікіх мерапрыемстваў з нагоды юбілею — адкрыццё фотавыставы Анатоля Каляды “Музыка душы — спадчына” ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Мелодыка фота

Наведаць экспазіцыю можна без дадатковых квіткоў, бо яна змешчана ў музейнай арт-кавярні. І сустрэча з творцамі, што глядзяць на нас з 1960—1980-х (а менавіта тады зроблены здымкі), атрымліваецца нязмушанай.

Лічыцца, што пра кампазітараў лепш за ўсё распавядае іх музыка. Але ж не менш скажуць і моманты, выхапленыя з гушчару бягучых падзей вокам неабыякавага карэспандэнта-мастака. Менавіта такім быў Анатоль Каляда, які пайшоў ад нас чатыры гады таму, але дзякуючы плённай працы ў газетах і на тэлебачанні пакінуў багатую фотавідэаспадчыну. Сярод гасцей, якія з цеплынёй згадвалі майстра на адкрыцці выставы, было і маладое кіраўніцтва творчага саюза (намеснік старшыні Віктар Кісцень), і знаныя кампазітары (Эдуард Ханок), і родныя, блізкія мэтраў (удава Ігара Лучанка). А са сцен на нас глядзелі многія з тых, каго ўжо няма: Анатоль Багатыроў, Генрых Вагнер, Яўген Глебаў, Сяргей Картэс, Алег Янчанка. Людзі сыходзяць — застаецца зробленае імі і занатаванае на здымках. Спадчына як музыка душы.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Здымаць і здымаць, каб глядзець і глядзець

Фільм “Леанід Шчамялёў. Усе адценні белага”, прэм’ера якога прайшла ў кінатэатры “Беларусь”, а сёння і ў эфіры тэлеканала “АНТ”, крытыкі ўжо паспелі ахарактарызаваць як новае слова ў беларускай дакументалістыцы. Так, аналагі і сапраўды не прыгадваюцца: ніхто ў нас яшчэ не ператвараў у акцёраў герояў мастацкіх палотнаў. Музей ажыўлялі па-рознаму (гэта апошнім часам увогуле паўсюдны трэнд), але толькі не такім непасрэдным і вынаходлівым чынам... Зрэшты, не будзем спойлерыць: глядзіце самі.

І хаця некаторыя ўжытыя ў фільме прыёмы падаюцца дыскусійнымі, яны настолькі арганічна ўплецены ў аўтарскі наратыў (*невыпадковы* ад першага і да апошняга кадра), што пад канец фільма ты, па шчырасці, страчваеш усялякае жаданне спрачацца. Як трапна адзначыў на прэм’еры прадзюсар карціны Уладзімір Бокун, ёсць фільмы добрыя і кепскія, а ёсць тыя, што хочацца глядзець і глядзець.

Калі ў зале запалілася святло, масцітая публіка здзіўлена перашэптвалася: хто ж аўтар? А калі на сцэну выйшла дзяўчына, пра існаванне якой амаль ніхто з прысутных і не здагадваўся, здзіўленне змянілася радасцю. Маўляў, вось яно, доўгачаканае новае імя ў беларускім кіно: Кацярына Шарамет!

— Простае і няпростае пытанне: што — альбо хто — Шчамялёў для вас асабіста?

— Здаецца, я ўжо адказала — наколькі ў мяне атрымалася... Магу хіба дадаць, што, працуючы над фільмам, я вельмі дбайна вывучыла творчасць Леаніда Дзмітрыевіча і ўсё, што ўдалося пра яго знайсці. Хацелася зразумець гэтую асобу, ухапіць характар... Мне было важна перадаць у фільме свае асабістыя адносіны да яе.

— Прызнайцеся, ці не падаецца вам гэты мэтр нейкім... старамодным? Усё ж вас аддзяляе ад яго цэлая эпоха.

— Што вы, у мастацтве не бывае нічога састарэлага! Сапраўднае мастацтва не можа выходзіць з моды — проста таму што гэта мастацтва! Яно, як слушна кажуць, “жыве ў вяках”. Шчамялёў для мяне — цалкам актуальны творца. Да ўсяго — модным часта становіцца добра забытае старое. Таму і ў мастацтве мінулых эпох можна знаходзіць крыніцу натхнення, чэрпаць адтуль нешта важнае для цябе і перадаваць ужо сучаснымі сродкамі.

— Адзін з такіх сродкаў, які ўразіў гледачоў найбольш, — “ажыўленне” класічных карцін. Ці не адчувалі вы небяспекі, урываючыся ў чужую творчасць?

— Так, падобная асцярога была. Дакранаючыся да чужога твора, заўсёды пераймаешся: а раптам ты яго патрывожыш, парушыш нешта важнае, няўзнак зменіш сутнасць? Гэта ж завершанае выказванне, якое мае свайго аўтара! Таму не буду здзіўляцца, калі знойдуцца праціўнікі майго падыходу ў гэтым фільме.

— Чаму ж вы яго выкарысталі?

— Бо ён дае магчымасць не проста паказаць карціны Шчамялёва, а нібы ажывіць той свет, у якім існаваў мастак, і занурыць туды гледача. Мне хацелася пабачыць свет вачыма Леаніда Дзмітрыевіча — менавіта такую ўнутраную ўстаноўку я сабе рабіла, калі працавала над фільмам. А натура, якую жывапісец маляваў, — яна ж не была статычнай! Гэтыя людзі рухаліся, гаварылі...

> Працуючы над фільмам, я вельмі дбайна вывучыла творчасць Леаніда Дзмітрыевіча. Хацелася зразумець гэтую асобу, ухапіць характар... Мне было важна перадаць у фільме свае асабістыя адносіны да яе.

— Ваш фільм дэманструе бліскучае валоданне сучаснымі тэхналогіямі працы з выявай. Аднак многія сёння баяцца, што інавацыі “заменяць” аўтара. Няўжо любы, у каго дома ёсць камп’ютар, зможа рабіць кіно?

— Так, я гэтае кіно ў сябе дома і рабіла, што з таго? Хіба дрэнна, калі ў кожнага з’явіліся такія магчымасці?

— Яшчэ ўчора розніца магчымасцей вымяралася бюджэтам. А цяпер чым?

— Вядома, адчуваннем стылю і густу. Камп’ютарныя праграмы адно дапамагаюць табе выканаць пастаўленую задачу, праявіць сваё бачанне і свой густ. Так, сучасныя AI-тэхналогіі навучыліся маляваць цудоўныя карціны, але бадай кожны пагодзіцца: нечым гэтыя творы адрозніваюцца ад “жывых”. Пры ўсёй дасканаласці і выразнасці ў іх адсутнічае душа. А душу ж робату не ўклееш!

— Вы, як кажуць, мала спалі, выкшталтоўваючы гэты фільм. Ці не крыўдна, што нехта кляпае “актуальны кантэнт” літаральна на каленцы? І менавіта з такім падыходам, дарэчы, асацыюецца ваша пакаленне...

— Нават не ведаю, што адказаць... Я, калі рабіла гэты фільм, успрымала яго найперш як глядач. Якія адчуванні з’явіліся б у мяне ў тую ці іншую хвілю... Што б я хацела ўбачыць у дадзены момант або якую музыку пачуць. Каб прывесці гэта ўсё ў адпаведнасць сваім уяўленням, зусім не шкада часу.

— Ці важна цяпер рэжысёру атрымліваць прафесійную адукацыю або можна навучыцца самому? Пытаюся ў вас як у чалавека з адпаведным дыпломам.

— Думаю, каб стаць рэжысёрам, адмысловую адукацыю мець неабавязкова. Калі я паступіла ў Акадэмію мастацтваў, нам на самым першым занятку сказалі: немагчыма навучыць быць рэжысёрам, можна толькі самому ім стаць. Рэжысёр — не проста кіраўнік здымачнай групы: ён павінен мець добрую інтуіцыю, тонкі густ, быць добрым псіхолагам... Хто гэтаму навучыць?

Так, патрэбныя прафесійныя веды можна знайсці і ў інтэрнэце. Іншая рэч, што ў акадэміі іх атрымаць куды прасцей. Прычым там не проста даходліва выкладуць інфармацыю, але яшчэ і звернуць увагу на памылкі. Калі ж ты абраў самастойны шлях, то вучыцца давядзецца толькі на ўласных. Але хіба гэта непераадольная перашкода, каб стаць рэжысёрам? Галоўнае — жаданне, цярпенне. І не баяцца рабіць памылкі.

— А чаму ж вы пайшлі на рэжысуру?

— Далёка не першы раз мне задаюць такое пытанне, але дасюль не ведаю, што на яго адказваць. Проста гэтак здарылася. Я заўсёды як магла праяўляла сваю творчую натуру, у школе розныя спектаклі ставіла... Але доўга не магла вызначыцца, кім хачу быць. А паколькі з дзяцінства вельмі любіла кіно і глядзела яго літаральна круглыя суткі, бацькі параілі ісці на рэжысёра. Бадай, інтуітыўна зразумела, што гэта маё. І неяк без асаблівых высілкаў атрымалася паступіць у Акадэмію (хаця ўсе казалі, што будзе цяжка). Ды і навучанне давалася лёгка. Адпаведна, усе карты сышліся...

Кацярына Шарамет

— А якія фільмы натхнілі?

— Мне падабаецца глядзець дакументальнае кіно пра гістарычныя падзеі і чалавечыя лёсы. Чамусьці яшчэ ў дзяцінстве з’явілася цікавасць да гісторыі. Мастацкія стужкі таксама падабаюцца — скажам, фэнтэзі ў духу Ціма Бёртана. Які мой улюбёны фільм? Цяжка сказаць — бо я люблю літаральна ўсё! Нават у нецікавай карціне знайду нешта вартае.

— З сеціва я даведаўся толькі пра адну вашу папярэднюю стужку — “Непарушная крэпасць”. Тэма фільма мяне трохі здзівіла. Чым вас так прывабіла царква Дзмітрыя Растоўскага ў вёсцы Выдранка?

— Гэта мая дыпломная праца, якая рабілася ў вельмі сціслыя тэрміны — як заўжды ў студэнтаў. Тэма “выбралася” неяк выпадкова. Я праходзіла практыку на тэлебачанні, і рэдактар распавёў мне пра тую царкву: ён казаў, што там рэальна адбываюцца цуды. І паколькі я заўжды прагну даведацца нешта новае і незвычайнае, загарэлася ідэяй туды з’ездзіць — хаця гэта самы край Беларусі, Краснапольскі раён. Нас вельмі добра прынялі. Людзі, атмасфера... Яно адгукнулася, і фільм, здаецца, атрымаўся. Мне паставілі выдатную адзнаку, ды і на розных фестывалях карціну прынялі добра.

— Наколькі важна для вас, пра што здымаць, або ў кожнай тэме вы знойдзеце свой падыход?

— Зразумела, на этапе станаўлення аўтар не заўсёды можа выбіраць тэму. Але я не вельмі прыдзірлівая. Можна выкапаць нешта цікавае нават у самых банальных рэчах — і ўжо адтуль развіць сваю драматургію.

— А калі б вам далі магчымасць выбіраць тэму самастойна? Што б хацелася зняць?

— Фільм пра людзей, прыналежных да розных этнасаў. Цыкл асабістых гісторый, аб’яднаных адной ідэяй. Люблю псіхалогію, мне вельмі падабаецца назіраць за людзьмі, і фільмы-партрэты — адзін з улюбёных жанраў.

— Што ж, жадаю, каб гэтае творчае падарожжа адбылося!

— Чаму падарожжа? Такі фільм можна зрабіць і не выязджаючы з Беларусі. У нас жывуць прадстаўнікі самых розных нацыянальнасцей, і было б цікава даведацца пра гэтых людзей пабольш. Думаю, сярод іх ёсць вельмі незвычайныя. Мне заўсёды карціць падняць невядомыя слаі нашай звыклай рэчаіснасці.

— Ці няма амбіцый у плане мастацкага кіно?

— Чаму ж, ёсць! І мастацкае, і дакументальнае... Ды якое заўгодна! Хацелася б здымаць, здымаць і здымаць! І ўсё дзеля таго, каб у нашым няпростым свеце з’явілася новая нотка дабра і пазітыву. Пабольш яркіх колераў у навакольнай шэрані!

— Здаецца, у вашым фільме пра Шчамялёва даўні сябар творцы Барыс Крэпак менавіта такую думку і агучыў: мастак імкнуўся расквеціць наш ад прыроды шэры ландшафт...

— Напэўна, у гэтым мы са Шчамялёвым падобныя. Я таксама люблю рознакаляровасць і насычанасць жыцця.

Ілья СВІРЫН

Тэатр як космас і маяк

У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага прайшла прэм'ера спектакля "Ідыёт" паводле аднайменнага рамана Ф. Дастаеўскага. Рэжысёрам-пастаноўшчыкам выступіла Івана Жыган з Сербіі. У размове з творцам, што адбылася пасля завяршэння маштабнай працы, прымеркаванай да гадавіны з дня смерці пісьменніка, мы акцэнтавалі ўвагу на найбольш значных для Іваны разважаннях пра тэатральнае мастацтва.

ПРА ТЭАТР

Тэатр — гэта метафізіка, нейкая метабіялогія, метаастраномія, метагеаметрыя. У чорнай дзірцы сцэны, нібы ў космасе, чалавек мае спецыфічную сілу прыцягнення і адштурхвання. Нельга проста стаяць на сцэне і вымаўляць словы, бо тэкст насамрэч — гэта ўся тая прастора, дзе жывуць душы герояў.

Мне вельмі важна, па якіх траекторыях людзі рухаюцца насустрач адзін аднаму. О, калі б мы ўмелі адчуваць чалавечае поле ў жыцці гэтак жа, як на сцэне, гэтак жа беражліва падыходзіць адзін да аднаго! Бо нашае нутро настолькі гарачае, што можа спапяліць. Шлях Чалавека да Чалавека амаль ніколі не можа быць прамым. Прамая лінія — метафара адсутнасці жыцця. Рухі і рытмы нашых фраз, крокаў, бегу заўсёды вельмі падобныя да пульсацыі сэрца. Кожнае дзеянне на сцэне мае сваю лінію, падобную да электракардыяграмы.

Ды сама тэатральная сцэна — гэта ж не скрыня, не падлога, не дошкі ці нейкія прылады. Крокі артыстаў па ёй я параўнала б з хадой па вадзе. Верыш усёй душой у тое, што робіш? Значыць, ідзеш. А не верыш — тонеш. Гэтак жа і са сцэнічным святлом. Бачна тое, што асветлена не звычайным пражэктарам, а пражэктарам сэрца. Таму што променем, які азарае ўсё навокал, павінен быць сам чалавек.

Гадоў 15 таму я напісала кнігу "Пячатка тэатра". Яшчэ тады выказала думку, што ў далёкай, як мне здавалася, будучыні акцёры пачнуць зноўку вучыць людзей мастацтву... кахаць. А зараз бачу: магчыма, тая "далёкая будучыня" ўжо наступіла? Мы крыху астылі, сталі больш рацыянальнымі — і надта многае згубілі. Тэатр жа павінен заставацца маяком, бо ў гэтым яго адказнасць перад чалавецтвам. Пражываючы адчужэнне, людзі ўсё больш і больш будуць прыходзіць у тэатр паглядзець на жывыя чалавечыя адносіны. Гэта заўжды з'яўлялася цудам, а сёння, у эпоху планшэтаў і робатаў, — тым больш.

Акцёры на сцэне імкнуцца прыстасоўваюцца адзін да аднаго, без гэтага не будзе гарманічнага ансамбля. Упэўнена, калі б усе працавалі над сваімі адноснімі так, як гэта робяць артысты ў добрым спектаклі, дасягаючы дасканаласці, на зямлі наступіў бы рай.

Што для мяне самае прывабнае ў тэатры? Прысутнічаць пры сакраманце Нараджэння. Ты быццам бачыш, як пачынаецца зара, з'яўляецца сонечнае святло. Знаходзішся быццам побач з аўтарам і яго героямі, становішся сведкам вялікай таямніцы — зараджэння кожнага ўздыху на сцэне. Бо ў тэатры з ішшыні ўзнікае слова, з цемры — святло, з вачэй выцякае сапраўдная, яшчэ гарачая сляза, з судотыку сэрцаў, нібы іскры з камянёў, — з'яўляецца агонь... Ты быццам прысутнічаеш пры родах! Стварэнне — працэс заўжды непаўторны. Але ў тэатры, як ні дзіўна, усё нейкім цудам паўтараецца — на кожным новым паказе спектакля. Нават Яе Вялікасць Смерць штораз мае сваю "рэпрызу". Што тэта, як не пераможныя здзекі тэатра са смерці?

ПРА ДЗЯЦІНСТВА

Мае бацькі — вельмі вядомыя артысты. Тата Стэва Жыган паставіў 60 маштабных спектакляў, цётка была найлепшым тэатральным касцюмерам Югаславіі, другая цётка — піяністка, брат — мастак. Я гушкалася не ў парку на арэлях, як усе дзеці, а на арэлях матроса Атэла, на якіх герой у спектаклі майго бацькі вельмі эфектна забіваў Дэздэмону. Пэўна, на гэтых велізарных арэлях, лежачы на белых шаўковых прасцінах цудоўнай Дэздэмоны, яшчэ ў дзяцінстве я зразумела словы таты: "Мастацтва звязвае чалавека з боскай прыродай, робячы яго часткай, а часам і рабом планетарных стыхій. Што чалавека ў вялікіх спектаклях няспынна хвошчуць вятры, збіваюць з панталыку туманы, палохаюць прывіды-ўявы, мучаць, раздзіраюць маразы, зводзіць з розуму спякота, зачароўвае неба... Што нашы лёсы на сцэне з'яўляюцца адной з формаў велічнага вар'яцтва прыроды".

У яго архівах захавалася вялікая перапіска з вядучымі дзеячамі тэатра: рэжысёрам Юрыем Завадскім, акцёрам Міхаілам Царуковым, з Мікалаем Бурляевым, Мікітам Міхалковым. Сярод маіх дзіцячых успамінаў — тое, як у нас начаваў знакаміты рэжысёр Георгій Таўстаногаў, у якога ў Пецярбургу тата ставіў югаслаўскія п'есы.

Часам я называла бацьку дыназаўрам, адчуваючы, што такіх, як ён, ужо тады амаль не засталося. Памятаеце, Дастаеўскі казаў пра Вярсілава ў рамане "Падлетак" як пра "апошняга еўрапейца": іх было, маўляў, "толькі тысячу". А зараз? Верагодна, можна пералічыць на пальцах.

АБ АВАНГАРДЗЕ І ТРАДЫЦЫЯХ

У бацькі ва ўсім былі новыя падыходы, ён казаў: "Мастацтва павінна не адлюстроўваць тое, што ўжо вядома чалавеку, а ствараць невядомае". Пры гэтым тата заўжды заставаўся прамым спадкаемцам Станіслаўскага. Бо шукаць нешта нябачанае і нечуванае — гэта не значыць адмаўляцца ад асноў нашага мастацтва. Тое якраз вельмі актуальная тэма. Людзі сёння часам выракаюцца роднай глебы, сям'і, традыцый, вечных каштоўнасцей. Тэатр першым раскрыў гэты духоўны крызіс. На Бялградскім міжнародным тэатральным фестывалі BITEF яшчэ ў 1970-х гадах на сцэне запанавалі гомасексуалы. Тут акурат і намякаўся скон сённяшняй спажывецкай цывілізацыі — толькі, не дай божа, не канец Чалавека і яго Мастацтва. Праваду аналогію з жывапісам. Калі ты ўмееш маляваць, як Леанарда да Вінчы, дык спакойна можаш сысці ў абстракцыю — і яна не страціць глыбокіх каранёў сэнсу. А калі не ўмееш маляваць, у тваёй абстракцыі застанецца толькі нікчэмная спроба ўцячы ад уласных комплексаў і невуцтва.

Чалавек мастацтва ніколі не павінен імкнуцца быць першым, але, азіраючыся, ён разумее, што ўвесь час аказваўся на барыкадах і рабіў нечаканыя крокі. Я шчаслівая, што ў мяне ўсё жыццё — на нейкіх рубяжах і гранях. Бо задача мастацтва, па-мойму, складаецца з таго, каб пераскочыць прорву і перавесці туды, на іншы бок, сваіх гледачоў — даць ім выйсце, руку, усмешку, прыступкі да неба.

АБ ПРЫГАЖОСЦІ

У Дастаеўскага ўсе галоўныя герояні — прыгажуні. Можа, гэта несправядліва, але ж, калі ступаеш нагой на пустазелле, яго менш шкада, чым калі раздушыш прыгожую кветку — а тым больш з Чырвонай кнігі. Таму калі гіне Настасся Філіпаўна, мы пражываем сапраўдную трагедыю. Настасся — адзіная гераіня ў сусветнай літаратуры, якая шпурляе грошы ў агонь. Гэтым жэстам яна перарасла свой час і паказала, што толькі з попелу згарэлых асігнацый мы, людзі XXI стагоддзя, можам уваскрэснуць, як птушка фенікс. А што да "прыгажосці, якая выратуе свет" — гэта і ёсць прыгажосць князя Мышкіна. У адрозненне ад супермена Заходу, які дэманструе мускулы, "супермен" Дастаеўскага дорыць нам сваё сэрца. Побач з ім усе мы становімся дзецьмі і, самае галоўнае, пачынаем смяяцца, як дзеці...

Цяпер вельмі шкадую, што падчас рэпетыцый не вяла дзённік, бо з вашымі таленавітымі людзьмі нараджалася сапраўднае натхненне.

ПРА ПАДРЫХТОЎКУ СПЕКТАКЛЯ

"Ідыёта" рабіў мой бацька ў 1990-х: я невыпадкова пазначыла тату сурэжысёрам цяперашняй пастаноўкі. У 2023-м, пачаўшы з "рымейка", мы атрымалі прывілею стартаваць не з нуля, а з вяршыні. Але гэта і велізарная адказнасць! Мы былі абавязаны паляцець з тых вяршынь і не зваліцца, а прызямліцца да сённяшняга гледача. І мы, здаецца, выдатна паляцелі — тым больш што вашыя артысты не пташаняты, а нейкія буслы, арлы, жураўлі, жар-птушкі. Руслан Чарнецкі ўжо пры першай сустрэчы натхніў мяне прыдумаць у спектаклі новую ролю — Фёдара Дастаеўскага. Ганаруся і тым, што паспела адкрыць у вашым тэатры новую зорку — Аляксея Качана, якога падчас рэпетыцый часцяком называла беларускім Марлонам Брандо. Больш за ўсё я настойвала на ўсмешцы, якая так патрэбна сённяшняму чалавеку: на прамяністай усмешцы князя Мышкіна — Андрэя Сенькіна, на зіхатлівай, бы заранак, усмешцы Аглаі — Вольгі Здзярскай, цёплай усмешцы генералі Епанчынай — Вікторыі Кавальчук, пагрозлівым смеху Рагожына — згаданага Аляксея Качана, заразным смеху Фярдышчанкі — Дэвіда Разумава. Дарэчы, струмені слёз Настассі Філіпаўны (Веранікі Пляшкевіч) і яе саперніцы Аглаі (Вольгі Здзярскай), па-мойму, цікавейшыя нават за самы цудоўны вадаспад. Але ж не патрэбныя дарагія авіябілеты, пералёты, бо ўсе гэтыя штосекундныя падзеі шчодра дораць вашыя артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага ў Мінску. Я вельмі ўдзячная ўсім — ад кіраўніцтва ўстановы і кампазітара Цімура Каліноўскага да работнікаў пашывачнага цэха. Бо касцюм — не тое, што артыст надзявае, а тое, што, наадварот, павінна агаліць цела, каб заззяла душа. У тэатры, як і ў жыцці, усё ўзаемазвязана. Усе павінны служыць адзін аднаму, быць адзін для аднаго слугамі — пра гэта яшчэ Дастаеўскі казаў. Таму ў нашым спектаклі і дом — не дом, ён часам выступае як сукенка Настассі Філіпаўны, а вытанчаныя прамяні святла становяцца шлейфам для гэтай сукенкі. Каб у апісанай фабрыцы новага жыцця атрымалася тая ўзаемазвязанасць, рэжысёр больш за каго-небудзь іншага павінен служыць усім, з кім працуе. Тады і ўзнікне сапраўдная "прыгода з невядомым канцом", як мой бацька называў спектаклі.

Я мела шчасце патрапіць у сапраўдны тэатр, цудоўны горад. І за гэта вельмі ўдзячная найперш міністру культуры Беларусі Анатолію Маркевічу, які зразумеў, наколькі патрэбен сёння князь Мышкін менавіта маладому пакаленню. Я патрапіла ў ансамбль, дзе ніводны акцёр не адмовіўся ад маленькай ролі, дзе мастацкі кіраўнік тэатра Сяргей Кавальчык "выкаваў" выдатны калектыў. Цяпер вельмі шкадую, што падчас рэпетыцый не вяла дзённік, бо з вашымі таленавітымі людзьмі нараджалася сапраўднае натхненне. Але галоўнае — спектакль нарадзіўся. Насамрэч!

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

На стыку культур

У Мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" працуе выстава Shiva-Shakti, прысвечаная Індыі.

Творы графікі і жывапісу нашых суайчыннікаў Андрэя Ярашэвіча і Аляўціны Башкатавай уяўляюць сабой сінтэз ідэй беларускай і індыйскай культур. Карціны Башкатавай заснаваны на ўспамінах пра месцы, якія пакінулі найбольш моцныя ўражанні падчас падарожжа мастачкі па Індыі. Работы Ярашэвіча даследуюць канкрэтныя тэмы. Напрыклад, у серыі "Шахматы" пераасэнсоўваюцца класічныя вобразы настольнай гульні. Па словах самога Андрэя, ён імкнецца максімальна ясна перадаць задуму, першапачаткова закладзеную ў карціну. Для творчасці Аляўціны характэрныя вобразнасць, метафарычнасць і недагаворанасць.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця экспазіцыі 22 лютага паўдзельнічаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Алак Ранджан Джа.

— Усе гэтыя работы былі створаны двума таленавітымі мастакамі з Беларусі. Калі я ўпершыню ўбачыў карціны, мяне ўразіла тое, наколькі прыгожа і аўтэнтычна перададзены сутнасць індыйскай культуры і зачараванне ёй, — так Алак Ранджан Джа выказаўся пра выставу.

З прывітальным словам да прысутных таксама звярнуліся рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская, дырэктар Мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" Марына Татарэвіч і самі творцы — Андрэй Ярашэвіч і Аляўціна Башкатава.

Выстава Shiva-Shakti — адно з мерапрыемстваў, прымеркаваных да 30-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Індыяй і Беларуссю. У канцы сакавіка пройдзе гала-канцэрт, які завершыць юбілейны для стасункаў паміж краінамі год.

Экспазіцыю можна наведаць да 14 сакавіка.

Да пазітыва!

"РАСФОТА" ўдзельнічае ў стварэнні Беларускага цэнтра захавання фотаспадчыны.

Пры падтрымцы міністэрстваў культуры Беларусі і Расіі ў Нацыянальным гістарычным музеі створаны сектар фатаграфічных даследаванняў. Вопытам вывучэння здымкаў з нашымі суайчыннікамі дзеляцца адмыслоўцы Дзяржаўнага музейна-выставачнага цэнтра "РАСФОТА".

Першай буйной падзеяй у ходзе супрацоўніцтва стала адкрыццё экспазіцыі вядомага гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава "Ад негатыва да пазітыва".

На выставе Нацыянальнага гістарычнага музея дэманструюцца здымкі 1840—1860-х гадоў, паштоўкі з відамі нашых гарадоў, фотаапараты.

Паралельна з гэтым у "РАСФОТА" да 19 сакавіка даступны праект "Ператварэнне. Метарэалізм у беларускай фатаграфіі 1980—1990-х гадоў".

Выстава "Талстой і Беларусь" адкрылася 1 сакавіка ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры. Гэтая часовая экспазіцыя — супольны з Дзяржаўным музеем Л. М. Талстога ў Маскве праект.

Супольны праект

Выстава, прымеркаваная да 195-годдзя класіка рускай літаратуры, прысвечана сувязі майстра з нашай краінай, а таксама ўплыву яго творчасці на беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя.

На старонках рамана "Вайна і мір", над якім аўтар працаваў сем напружаных гадоў, шмат распавядаецца пра гарады і вёскі, дзе змагаліся героі Талстога. У экспазіцыі прадстаўлены ілюстрацыі да славутага твора, гістарычныя гравюры і рэпрадукцыі. На іх — апісаныя ў рамане баі, што адбываліся ў беларускіх мясцінах: пераход праз Нёман, бітвы пад Салтанаўкай, на Бярэзіне.

На выставе таксама можна пазнаёміцца з чарнавымі рукапісамі рамана, матэрыяламі, якія расказваюць пра вайсковы досвед класіка.

Яшчэ адзін раздзел экспазіцыі змяшчае пераклады кніг Льва Талстога на нашу мову з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Гэта апавяданні для дзяцей, "Севастопальскія апавяданні", раман "Воскрасенне", аповесці "Хаджы-Мурат", "Каўказскі палоннік" ды іншыя.

Акрамя таго, праект уключае цікавыя неапублікаваныя архіўныя матэрыялы, прадстаўленыя Дзяржаўным музеем Л. М. Талстога, матэрыялы са збораў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

Выстава, якая працягнецца да 26 мая, зацікавіць навукоўцаў, даследчыкаў, музейных супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў філалагічных факультэтаў, а таксама ўсіх, хто любіць гісторыю і літаратуру.

Сунічныя паляны

Колькі слоў пра матчыну мову

Нястомны Міхаіл Велер разважае наконт булгакаўскай высновы "Рукапісы не гараць". Нібыта падчас іспанскай інквізіцыі адзін з начытаных "ведзьмакоў", пазіраючы на кніжнае вогнішча, зазначыў з сумам: "Рукапісы не гараць, гарыць папера, а словы вяртаюцца да Бога". Ад сябе дадам: словы вяртаюцца да Бога, калі не патрэбны чалавеку. Як толькі становяцца неабходныя, Бог адпраўляе іх на Зямлю. Кругаварот слоў у прыродзе.

Карацей, я зноў пра моўныя скарбы, бо баліць. Іх губляць — сабе даражэй. Дарэчы, турботы журналістаў і работнікаў культуры з гэтай нагоды супадаюць. Беларускае слова нам дадзена як магутны сродак мацавання культуры, мастацтва — нацыі. Той адпачынак паўнацэнны, пасля якога гонарам напаўняецца душа. Гонарам за Беларусь і беларусаў.

УСХОД — ШТУКА ТОНКАЯ

Я з Гомельшчыны — усходнік. Кажуць, у тых мясцінах мала што засталося ад беларускай лексікі. Маўляў, вынік розных уплываў. Па мне — дык лухта! Усход — штука тонкая. У нас слоў унікальных — як суніц на сонечнай палянцы, і аж да Смаленска! Праўда, не ўсе мы пакуль зацятыя ягаднікі.

Падаецца, менавіта на ўсходзе прыдумалі трасянку — моўны кампраміс, народжаны на стыку полюсаў білінгвізму (мне ў Ветцы на гэта сказалі б: "Рагін, не *вумнічай*!"). Жончына бабуля (сваіх не памятаю) злавалася, калі я казаў на літаратурнай мове: "Не разумею. Гавары на нашай!" Оду трасянцы я спяю ў іншы раз. А цяпер больш пільна перабяром суніцы ў маім моўным кошыку.

ВОСЬ ДЫК ЗНА́ХАДКА!

Аднойчы мы са стрычным братам ледзьве не пабіліся. Ён, недасяжны знаўца, сцвярджаў, што ў вёсках Гомельскай вобласці беларуская мова хаджэння не мела, рэй вяла толькі руская. Так, масавай літаратурная мова не была. Літаратурная — для літаратуры. Было б дзіўна, калі б, скажам, мой знаёмы пастух Міхась Сутарма гаварыў (асабліва ў дзень зарплаты) на класічнай мове цэнтральнай Беларусі.

Але ж самыя каштоўныя словы ў маёй калекцыі — з вёсак Гомельшчыны. Да прыкладу, у нас раяць: "Зрабі сёння тое, што на заўтра запланаваў. Як *зна́хадка* будзе!" Не знахо́дка, заўважце, а зна́хадка. У каго язык варухнецца назваць гэтае слова русізмам?

НІДЗЕ НЕ ЧУЎ

Гэты выраз выхапіў на гомельскім аўтавакзале, і сэрца, знявечанае мінскім вэрхалам, забілася па-маладому. Адна кабета другой гаварыла: "*Памелася* памідоры высадзіць, а тут падмарозіла". Памелася — гэта наскае, у значэнні "хацела". Этымалогія, відаць, вось якая: хацела мець (зрабіць), а не атрымалася. Больш нідзе такога не сустракаў.

Няўцямны — слова агульнараспаўсюджанае (яшчэ ў нас кажуць: *неўкавырны*). А ёсць варыяцыі, таксама нібыта толькі з нашага краю: "У яго, няўклюды, *цямы* няма".

Ведаю і прыклад ужывання слова ў іншым, неагульнапрынятым значэнні. Цётка Лена супакойвала: "Не хвалюйцеся. *Клопат*!" Клопат тут — "усё будзе добра". Такога больш нідзе не чуў і не чытаў.

"РАБЯТЫ-ЖАРАБЯТЫ"

"Не ўжывай ты слова *рабяты*", — вучыў мяне дасведчаны журналіст і цудоўны празаік Мікола Гіль, які валодаў бездакорным філалагічным густам.

Сапраўды, *рабяты-жарабяты* роднай мове не пасуюць. Чым замяніць? У першай камандзіроўцы шмат гадоў таму пачуў дзесьці на Віцебшчыне слова *ма́льцы*. Рускі аналаг — *пацаны*. І заклік: "Карыстайцеся нашым!" Наша заўжды непадманнае ды шчырае.

Чарговая навука ад Гіля: "Хваліць трэба не *«малайцы»*, бо гэта народ Паўднёва-Усходняй Азіі, а *«малайчыны»*. А яшчэ я займеў ад шаноўнага Міколы Сямёнавіча цудоўнае слоўца *пашавэлак* — маленькі сабачка. Гіль, дарэчы, з Лагойшчыны, з Цэнтральнай Беларусі, дзе і нарадзілася наша літаратурная мова.

А МАМА НАВОШТА?

Працаваў у "Полымі" неблагі празаік Адольф Варановіч. Адзначаў ён з усёй катэгарычнасцю: "Я на вашы слоўнікі ніяк не рэагую. Гавару так, як мама казала". Выснова, не пазбаўленая сэнсу. Ці атрымаліся б афіцыйныя слоўнікі без народнай лексічнай асновы? Мясцовая гаворка ды шанаванне айчыннай літаратуры і робяць нас беларусамі, што не цураюцца роднай зямлі. У адваротным выпадку так і будзем называць крамы лаўкамі.

Яўген РАГІН

"Уладарка нявызнаных скарбаў"

Так апісваў родную мову паэт Аляксей Зарыцкі. Сапраўды, колькі матчына слова ні вывучай — у яго заўсёды знойдзецца новы скарб-сакрэт. Але ж мова гатовая дзяліцца таямніцамі з усімі ахвотнымі.

Міжнародны дзень роднай мовы шырока адзначылі па ўсёй краіне. Так, у бібліятэках **Астравецкага** раёна прайшлі інтэрактыўныя хвілінкі, спаборніцтвы, паэтычныя гадзіны, бліц-апытанні. Ладзілі нават бібліяфрээі і літаратурны фаэтон. Прызнацца ў любові да роднага слова было мноства спосабаў і магчымасцей. Пра гэта паведаміла бібліятэкар Астравецкай раённай бібліятэкі **Вольга Заянчкоўская**.

Наведвальнікі бібліятэк **Лідчыны** і **Зэльвеншчыны**, акрамя як да іншых мерапрыемстваў, актыўна далучыліся да Агульнанацыянальнай дыктоўкі. Гэта сталася цудоўнай нагодай успомніць яшчэ і гісторыю роднага краю, Лідскі замак і 700-годдзе раённага цэнтра, а на Зэльвеншчыне — Сынкавіцкую царкву-крэпасць. Інфармацыяй з намі падзяліліся **Кацярына Сандакова**, бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай раённай бібліятэкі, і **Вольга Камякевіч**, намеснік дырэктара Зэльвенскай раённай бібліятэкі.

У **Жодзінскай** цэнтральнай гарадской бібліятэцы, піша **Ірына Хілюціч**, зацвіла папараць-кветка, каб ажыццяўляць мары герояў беларускай літаратуры. Прысутным заставалася толькі захоплена сачыць за здзяйсненнем жаданняў і наталяцца крынічнай чысцінёй беларускай мовы.

На **Краснапольшчыне** народнае аматарскае паэтычнае аб'яднанне "Світанак" адчыніла дзверы творчай гасцёўні "Не адракуся спадчыны сваёй". Тут падвялі вынікі III Расійска-беларускага конкурсу аматараў літаратурнай творчасці "Мы на матчынай мове жывём" і ўручылі дыпломы пераможцам. Мерапрыемства прымеркавалі і да Года міру і стварэння. Слова можа і павінна быць стваральным, заклікаць да гуманістычных ідэалаў, да мірнага суіснавання, упэўнены члены аб'яднання "Світанак". Пра гэта нам расказала яго кіраўнік **Валянціна Марчанка**.

Захоўваць матчыну мову і перадаваць яе наступным пакаленням заклікалі вучняў сярэдняй школы № 1 **Быхава** супрацоўнікі раённага Цэнтра культуры, падзялілася загадчык метадычнага аддзела **Святлана Саламевіч**.

Вера НІКАЛАЕВА

Дзень роднай мовы адзначылі на Быхаўшчыне

Экслібрыс

Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі

Што? Каштоўная і ўнікальная манаграфія, напісаная ў навукова-папулярным стылі, месціць пад вокладкай вынік плённага супрацоўніцтва спецыялістаў з розных навуковых галін — геалогіі і гісторыі. Выданне, прысвечанае выяўленню і вывучэнню адметных прыродных аб'ектаў, складаецца з 10 раздзелаў, дапоўнена картамі, што адлюстроўваюць пашырэнне тых ці іншых тыпаў камянёў на тэрыторыі Беларусі, а таксама ілюстрацыямі (больш за 100 фотаздымкаў пераважна з аўтарскіх экспедыцый) і каляровай укладкай; факталагічны матэрыял зручна сістэматызаваны і суправаджаецца геаграфічным паказальнікам. Валуны — помнікі не толькі матэрыяльнай, але і духоўнай культуры, сведкі і ўдзельнікі язычніцкіх і хрысціянскіх абрадаў, з гэтымі прыроднымі артэфактамі звязаныя шматлікія мясцовыя легенды і паданні, розныя гістарычныя падзеі. У кнізе прыведзены апісанні больш чым 500 камянёў, дадзена геалагічная і этнаграфічная характарыстыка. Некаторыя з культавых валуноў знаходзяцца ў спісе матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Беларусі.

Хто? Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, дырэктар Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі, доктар геолага-мінералагічных навук Аляксандр Карабанаў; вядомыя археолагі, кандыдаты гістарычных навук Людміла Дучыц і А. Зайцаў; навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута Міністэрства прыродных рэсурсаў Валерый Вінакураў і журналіст, фалькларыст Ірына Клімковіч.

Каму? Супрацоўнікам устаноў культуры, краязнаўцам, бібліятэкарам, гісторыкам, фалькларыстам, культуролагам, спецыялістам у галіне прыродакарыстання, археалогіі, увогуле шырокаму колу чытачоў.

Андрэй КРАСІЦКІ

Выданне вы можаце знайсці ў бібліятэках, кнігарнях або замовіць на сайце "Акадэмкніг" з дастаўкай па Беларусі.

Юбілейны вечар ансамбля "Крынічанька"

Суладдзе жыцця і музыкі

Пры поўным аншлагу прайшоў канцэрт, прысвечаны 35-годдзю народнага фальклорнага ансамбля "Крынічанька", якім кіруе Сяргей Аляксеевіч Ерашэнка. Калектыў плённа папулярызуе спадчыну Светлагорскага раёна.
З 2004-га заслужана носіць ганаровае званне "Народны". Высокі ўзровень пацвярджае актыўнай канцэртнай дзейнасцю, удзелам у міжнародных, рэспубліканскіх, абласных мерапрыемствах...
Але з чаго пачынаўся творчы шлях таго, хто ўзначальвае "Крынічаньку"? І дзе шукаць вытокі натхнення?

У дзяцінстве Сярожа Ерашэнка заўсёды пачынаў спяваць, ледзь пачуўшы па радыё мелодыю. У музычнай школе хлопчык вучыўся граць на баяне. Цікавіла юнака і народная музыка, і класічная, і джаз. Удзельнічаў у школьных канцэртах. Потым паступіў у Гомельскае музычнае вучылішча імя Нестара Сакалоўскага па класе баяна. І вось дзіва — паралельна захапіўся філасофіяй. З задавальненнем студэнт знаёміўся з усімі прадметамі па спецыяльнасці, штодня ўдасканальваў тэхніку ігры на баяне і адначасова чытаў літаратуру па старажытнай навуцы. Філасофія, як і музыка, дапамагала хлопцу пашырыць і ўмацаваць светапоглядныя пазіцыі.

Служыў у войску, пасля скончыў музычнае вучылішча і атрымаў накіраванне на працу. Але ў Гомель завітаў у пошуках выканаўцаў дырэктар светлагорскага Палаца культуры хімікаў Уладзімір Громаў. Так Сяргей трапіў у раённы цэнтр.

АСПІРАНТ

Спачатку Сяргея Аляксеевіча прызначылі акампаніятарам народнага хору, затым — дзіцячага танцавальнага ансамбля "Чабарок". Практыка была складаная і карысная. Праца з ансамблем запатрабавала далейшага творчага ўдасканалення. Належала і з вялікім рэпертуарам разабрацца, і кожны рух гурта музычна аформіць. Плюс падрыхтоўка аранжыровак.

У 1987-м Ерашэнка паступае на завочнае аддзяленне Мінскага інстытута культуры на факультэт народнай творчасці. У гэтым жа годзе Сяргея Аляксеевіча прызначаюць кіраўніком ансамбля народнай песні "Крынічанька". Фальклор — зусім іншая музычная і інструментальная мова, новыя падыходы да работы з калектывам. У 2000-м творца заканчвае аспірантуру інстытута культуры.

ДЫРЭКТАР

Ерашэнка прызначаюць дырэктарам Дома культуры энергетыкаў. Музыкант вучыцца вырашаць кадравыя пытанні. Фінансавыя і гаспадарчыя — таксама ў полі зроку кіраўніка. Калектыў зрабіўся больш згуртаваным. Кола паслуг для насельніцтва пашырылася: да выстаў і моладзевых вечарын дадаліся танцавальныя рынгі, забаўляльна-канцэртныя і дзіцячыя анімацыйныя праграмы. Сталі надзвычай папулярнымі вечары апачынку для прадпрыемстваў горада.

У складзе ДК — восем аматарскіх аб'яднанняў. Гэта каля 400 чалавек. Больш за 190 асоб — сябры калектываў мастацкай самадзейнасці. Ёсць узорныя: вакальная студыя "Жавароначкі", музычны тэатр "Папяровая фантазія", ансамбль народнага танца "Задорынка", а таксама народныя: фальклорны ансамбль "Крынічанька", студыя аперэты "Рампа". На IV Рэспубліканскім конкурсе мастацтваў "Вясёлка талентаў" узорная вакальная студыя "Жавароначкі" атрымала дыплом III ступені, стала лаўрэатам на IV Міжнародным фестывалі мастацтваў.

ЭКСПЕРЫМЕНТАТАР

Любімае дзецішча — ансамбль "Крынічанька" — Сяргей Аляксеевіч пры пераходзе на працу ў ДК забраў з сабой. У рэпертуары народнага калектыву — звыш 200 песень, большасць запісана ў Светлагорскім раёне. Сярод іх калядныя, веснавыя, юр'еўскія... На канцэртах — толькі жывы гук. Выступала "Крынічанька" ў Расіі, Аўстрыі, Германіі, Італіі, Польшчы, Швейцарыі. Усюды спявае па-беларуску.

Ерашэнка эксперыментуе з рэпертуарам калектыву, з падыходам да апрацоўкі фальклорнага матэрыялу, з арганізацыяй экспедыцый, з палескай манерай выканання.

У складзе ансамбля — 10 чалавек ва ўзросце ад 40 да 80 гадоў. Найстарэйшыя ўдзельнікі — Мая Пішчык, Кацярына Шылічава, Вольга Бабкова. Жанчыны перанялі песні ў бацькоў. Пры калектыве створана танцавальная група і працуе суправаджальны музычны гурт.

Нядаўна "Крынічанька" зладзіла чарговы канцэрт, які прайшоў з нязменным аншлагам.

Галіна КАПЕЦКАЯ,
Светлагорск

У рэпертуары народнага калектыву — звыш 200 песень, большасць запісана ў Светлагорскім раёне.



Светлагорскі дом культуры энергетыкаў

Чароўныя пяцелькі

Рукам чалавека падуладна ўсё: яны могуць будаваць дамы, пісаць казкі і апавяданні, увішна граць на музычных інструментах, гатаваць смачныя стравы. Дзякуючы рукам, наш свет становіцца больш яркім, цікавым. А людзі, якія ўсё гэта робяць, адораныя Богам, бо валодаюць стваральнай сілай. Такая ёсць і ў працавітай Людмілы Лебедзевай.

Усмешлівыя снегавічкі, круглатварыя лялькі, пухнатыя мядзведзікі і зайчыкі выглядаюць вельмі рэалістычна. Так і хочацца памацаць.

У Альхоўскай сельскай бібліятэцы часта ладзяць выставы цацак Людмілы Васільеўны. Гэтыя экспанаты літаральна заварожваюць наведвальнікаў. Асабліва маленькіх чытачоў, якія падоўгу стаяць, разглядаючы стракатых герояў любімых казак. Старэйшыя ж дзівяцца, імкнуцца даведацца, як створаны ўсе гэтыя незвычайныя рэчы. Сама Людміла пра хобі распавядае сціпла і не лічыць сябе выключнай асобай.

Каля 40 гадоў жыцця жанчына аддала Альхоўскай кардоннай фабрыцы. Спачатку вучылася ў дасведчаных калег, а пасля сама дзялілася вопытам з маладымі: 22 гады Людміла Лебедзева з задавальненнем выконвала абавязкі майстра.

А калі яна авалодала сакрэтамі вязання? Хтосьці палічыць, што захапленне прыйшло ў дзяцінстве на школьных уроках працы. Але Людміла Васільеўна не надта паважала рукадзелле. Дзяўчына бегла ў майстэрню да хлопцаў, каб разам з імі вучыцца выпальваць. І гэта атрымлівалася ў яе не горш за юнакоў.

А вось любоў да кнігі ў Людмілы была заўсёды. Больш 14 гадоў таму, чарговы раз наведаўшы бібліятэку, жанчына ўзяла некалькі часопісаў. У адным убачыла вязаны дзіцячы капялюшык і расказ пра яго. Галаўны ўбор вельмі спадабаўся. І Людміла Васільеўна паспрабавала звязаць. У яе ўсё атрымалася.

Так пачаўся нялёгкі, цікавы шлях да рамяства. Сотні рознакаляровых клубкоў прайшлі праз рукі жанчыны. Асабліва майстрыху захапілі вязаныя цацкі. Утульныя, мяккія, яны станавіліся цудоўным падарункам для родных або ўпрыгожвалі кніжную паліцу.

Аднойчы бібліятэкар, дазнаўшыся пра захапленне Людмілы Васільеўны, прапанавала аформіць дзіцячую выставу "Свет ведаў". Так нарадзілася з дзясятак прыгожых і дзіўных светлячкоў рознага памеру і колеру. Экспазіцыя вельмі прывабвала маленькіх чытачоў, дапамагала ім паглыбіцца ў свет творчасці і літаратуры. Дэбют атрымаўся надзвычай удалым.

Потым творца з бібліятэкарам Юліяй Заруба вырашылі падрыхтаваць вязаных герояў "Шляхціца Завальні..." Яна Баршчэўскага. І зноў удача — вырабы Людмілы Лебедзевай упрыгожылі і раённую бібліятэку.

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ,
бібліятэкар Астравецкай раённай бібліятэкі

Хаджу закаханы ў твае краявіды

Нацыянальны мастацкі музей у новым выставачным праекце, рэалізаваным за кошт гранта Прэзідэнта, даследуе вобраз Радзімы ў творах беларускіх аўтараў.

Фрагмент экспазіцыі

Адзін паэт напісаў, што Радзіма пачынаецца з жанчыны. Другі — што з карцінкі ў буквары і вясенняй запеўкі шпака. Вяду да таго, што вобраз Бацькаўшчыны ў любым відзе мастацтва мае безліч трактовак. Гэта і канкрэтны кавалак зямлі з прыроднымі ды архітэктурнымі перлінамі, і суродзічы-сучаснікі, і продкі... Па сутнасці, значная частка музейнай калекцыі беларускага мастацтва і ёсць анталогія вобраза Радзімы. Ад пасцілак народных майстрых да шляхецкіх партрэтаў, ад “Бітвы на Нямізе” да “Абаронцаў Брэсцкай крэпасці”, ад веснавых ручаёў Бялыніцкага-Бірулі да заснежаных прастораў Шкарубы.

Куратар праекта Любоў Сысоева, зыходзячы з пазіцыі, што большасць жывапісцаў распрацоўвала тэму Айчыны праз апяванне прыроды, зрабіла акцэнт на пейзажах і прадставіла шырокую панараму гэтага жанру з багатай гісторыяй. Пункт адліку — першая палова XVIII стагоддзя, калі элементы краявідаў з’явіліся ў іканапісе і кніжнай гравюры. Такім чынам, адкрываюць экспазіцыю абразы “Укрыжаванне з прадстаячымі”, “Цалаванне Іаакіна і Ганны. Дабравесце Ганны” і “Святы Мікалай”, кампазіцыі якіх дапоўнены пейзажнымі фрагментамі. Далей, у работах мастакоў ад XIX стагоддзя да нашых дзён, відарысы прыроды і архітэктуры выходзяць ужо на першы план.

Зрэшты, для частых наведвальнікаў музея сюрпрызаў не будзе: куратар сабрала творы з залатога фонду, якія раней дэманстраваліся або ў пастаяннай экспазіцыі, або на часовых выставах апошніх гадоў. Да прыкладу, гледачам ізноў прапануюць сустрэчу з работамі Міхася Філіповіча. Паказаны яго палотны “Карагод (Ляльнік)”, “Духаў манастыр”, “Дом гарадскога суда ў Мінску” і дробная пластыка — гліняныя статуэткі з народнымі вобразамі. Пазалетась установа ўшанавала памяць Філіповіча буйным праектам “Лёс мастака”, і цяперашняе вяртанне да спадчыны майстра лагічнае, бо той быў адным з самых пладавітых распрацоўшчыкаў этнаграфічнай і гістарычнай тэм у айчынным жывапісе, сапраўдным знаўцам народнай культуры.

Суседнічаюць з Філіповічам не менш вядомыя ў нас і за мяжой асобы, якія заклалі падмуркі нацыянальнай школы пейзажа, — Апалінарый Гараўскі, Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Фердынанд Рушчыц і Станіслаў Жукоўскі, майстры эпічнага абагульнення XX стагоддзя Віталь Цвірка, Віктар Грамыка, Павел Масленікаў. Пейзажны зрэз дапаўняецца зборам скульптурных жаночых партрэтаў — “Пяшчота” Леаніда Давідзенкі, “Паляшучка” Дзмітрыя Папова, “Першы сноп” Мікалая Шарэнкі.

Асобны раздзел прысвечаны графіцы. У ім знайшлося месца малюнкам Язэпа Драздовіча, якія перайшлі Нацыянальнаму мастацкаму ў спадчыну ад былога Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча. Пачынальнік гістарычнай тэмы ў айчыннай творчасці захаваў віды Замкавай гары і Татарскіх агародаў у Мінску, мястэчка Свір ды іншых куткоў. Узняты з пасляваенных руін горад збярог Леў Лейтман у акварэлях “Праспект імя Сталіна” і “Галоўпаштамт” — светлых, лёгкіх, жыццесцвярджальных. З не меншым замілаваннем сталіцу, а дакладней радасныя сцэны з яе штодзённага жыцця, паказаў Анатоль Волкаў (серыя “Мінск і яго жыхары”).

Адметна, што значная частка аўтараў, нарадзіўшыся на беларускай зямлі, атрымлівала адукацыю і шмат працавала ў іншых краях, але пры гэтым не забывалася на Бацькаўшчыну. Так, у экспазіцыі паказаны “Рамантычны пейзаж” Барыса Заборава — апошняе палатно мінскага перыяду, прынцыпова адрознае ад зробленых у Парыжы.

Скульптура просіцца на вуліцу

На выставе “Скульптура — гораду” дэманструюцца творы, якія ўжо ўпрыгожылі мінскія вуліцы і якія толькі прэтэндуюць на месца ў грамадскай прасторы.

Чарговая экспазіцыя, разгорнутая ў сталічным Палацы мастацтва, адначасова стала справаздачай скульптараў за апошнія дзесяцігоддзі і штуршком да абмеркавання планаў. “Незнаёмая” і “Дзяўчынка з парасонам” Уладзіміра Жбанава, “Брама памяці” Канстанціна Касцючэнкі, “Разбіты ачаг” Максіма Петруля, вялізная груша, стылізаваны ткацкі станок ці каваныя “выцінанкі” са станцый метрапалітэна — без іх ужо цяжка ўявіць сэрца нашай краіны. Пра гэтыя і дзясяткі іншых скульптур на выставе распавядаюць планшэты з фотаздымкамі.

У цэнтры залы дэманструюцца дзве карты сталіцы, на якіх пазначаны творы, усталяваныя за савецкім часам і ў гады незалежнасці. Па схемах няцяжка прыкмеціць тэндэнцыю: пераважная большасць аб’ектаў размешчана ў цэнтры горада. Выключэнне складаюць кампазіцыі “Беларусам — героям космасу” Івана Міско на скрыжаванні праспекта Дзяржынскага і вуліцы Касманаўтаў, “Беларусь партызанская” Валянціна Занковіча каля станцыі метро “Магілёўская” ды іншыя лічаныя творы.

З аднаго боку, лагічна даваць прапіску скульптурам у месцах, дзе праходзяць самыя вялікія патокі людзей. З другога, перыферыя не мусіць заставацца беднай на мастацкае аздабленне. Ды ў некаторых пунктах паблізу кальцавой, напрыклад побач з гандлёвымі цэнтрамі на Малінаўцы ці Каменнай горцы, гараджан бывае не менш, чым на той жа Камароўцы ці ў Міхайлаўскім скверы. Да таго ж забудова так званых спальнікаў (што панэльныя дзевяціпавярховікі, што псеўдаэлітныя жылыя комплексы) куды менш выразная за архітэктуру цэнтральных кварталаў.

Большая частка экспазіцыі прысвечана якраз творам, якія толькі чакаюць на сваё месца ў вялікім горадзе. У значнай ступені гэта аўтарская скульптура філасофскага, сімвалічнага і бытавога характару ў розных стылях і кірунках — ад рэалістычных помнікаў гістарычным асобам да гратэскнай “Урадлівасці” і абстрактнага “Адлюстравання”. Аўтары закранаюць многія значныя для грамадства тэмы: сямейнага ладу, шчаслівага маленства, беларускай спадчыны. На фоне даволі традыцыйных аб’ектаў з бронзы і каменю абстрактнай пластыкай і яркімі насычанымі колерамі прыцягваюць увагу палімерныя “Нейраструктуры” Захара Кудзіна.

Мемарыяльная скульптура прадстаўлена праектам помніка Уладзіміру Караткевічу за аўтарствам Льва і Сяргея Гуміляўскіх. І грамадства дакладна прагаласуе за ўсталяванне такога манумента ў сталіцы, мяркуючы па сучасным попыце на творы Уладзіміра Сямёнавіча: “Дзікае паляванне караля Стаха” заняло першую пазіцыю ў топе продажу сярод мастацкіх кніг у сетцы “Белкніга”. Такой жа падтрымкай, верагодна, можа заручыцца яшчэ адзін прэтэндэнт на ўвекавечанне ў бронзе. На выставе прэзентаваны эскіз помніка Каралю Гутэн-Чапскаму. Сапраўды, мінскага гарадскога галаву ўжо ўшанавалі мемарыяльнай дошкай на будынку піўзавода “Аліварыя”. Ці дастаткова для асобы такога маштабу? Нагадаю, пры Чапскім у нашай сталіцы запрацавала конка, з’явілася электрычнае асвятленне, адкрыліся тэатр, навучальныя, культурныя і лячэбныя ўстановы.

Данііл ШЭЙКА
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Леў Гуміляўскі, Сяргей Гуміляўскі. Праект помніка Уладзіміру Караткевічу

Старшыня секцыі скульптуры Беларускага саюза мастакоў
ІВАН АРЦІМОВІЧ:

— За апошнія 10 гадоў мы правялі серыю падобных праектаў і пастаянна вяртаемся з калегамі да таго, што скульптура павінна выходзіць у грамадскае асяроддзе, не замыкацца ў прасторы творчых майстэрняў і невялікіх выставачных залаў. І мы заклікаем да дыялогу паміж мастакамі, архітэктарамі і гарадскімі ўладамі. Хацелася б, каб вуліцы нашых гарадоў надалей напаўняліся прафесійнымі творамі. Мінск вялізны, і важна паспяваць за яго пашырэннем, каб нашыя аб’екты своечасова траплялі ў асяроддзе і стваралі там культурны код, напаўнялі прастору пэўным зместам.

Вельмі ёмістай формай з’яўляецца парк скульптур. Але назва ўмоўная: гэта можа быць і прыроднае, і архітэктурнае, і камбінаванае асяроддзе. Цяпер у двухмільённай сталіцы такой прасторы няма, хаця шмат зроблена для развіцця ландшафтна-паркавай скульптуры.

Дзмітрый Гаралевіч

Трыадзінства майстра

Жывапіс. Скульптура. Тэатр

Віцебскі мастак Дзмітрый Гаралевіч бездакорна стварае і дзівосна-казачныя светы, і рэфлексіўныя палотны, прадыктаваныя рэчаіснасцю і асабістымі душэўнымі парывамі. Адданы жывапісу, толькі гэтым відам мастацтва майстар не абмяжоўваецца.

Творца не вельмі ўтульна пачуваецца ў шматлюднасці, больш любіць пабыць у самоце. Мо таму ў яго гарадскіх краявідах чалавечыя постаці з’яўляюцца рэдка?

Падчас вучобы на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржуніверсітэта з Дзмітрыя і яго аднакашнікаў імкнуліся вырасціць універсальных майстроў: не толькі давалі асновы малюнка і жывапісу, але і вучылі працаваць з дрэвам і металам. Пазней кожны мог абраць улюбёны занятак і ўжо самастойна ўдасканальваць навыкі. Спадар Гаралевіч аддаў перавагу жывапісу, але з часам пачаў асвойваць усё новыя палі.

СУВЕНІР З МАРАЛЛЮ

Дзмітрый з усмешкай прызнаецца: “Развітвацца з дзяцінствам не хочацца зусім”. Лёс падарыў магчымасць даросламу творцу заглыбіцца ў свет маленства. Ужо пяць гадоў мастак шчыруе ў віцебскім тэатры “Лялька”. Хоць у рэпертуары ўстановы ёсць спектаклі для рознаўзроставай аўдыторыі, найбольш актыўна трупа працуе менавіта з юнымі гледачамі. Збудаваць на сцэне прывабны ды зразумелы малым свет для Дзмітрыя не праблема: дапамагае тое самае памкненне захаваць унутранае дзіця, уменне зірнуць на жыццё вачыма хлапчука. Майстар і цяпер любіць чытаць казкі. Не дзіва, што аднойчы мастаку-канструктару, які адказвае выключна за стварэнне лялек, даверылі працу пастаноўшчыка, то-бок аўтара ўсяго выяўленча-пластычнага вобраза дзеі, у тым ліку дэкарацый і касцюмаў.

Першай работай у новай якасці стала містычная гісторыя “Лялькі Ціма Талера, або Прададзены смех” рэжысёра Міхася Клімчука. Нагадаю, пазалетась пастаноўка атрымала Нацыянальную тэатральную прэмію. Для работы над наступным спектаклем “Мой вялікі маленькі дзядуля” мастак узяў у суаўтары хлопчыкаў і дзяўчынак, якія лячыліся ў рэспубліканскім цэнтры анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Ад іх работ Дзмітрый адштурхоўваўся ў распрацоўцы аздаблення — і ўдала захаваў эстэтыку дзіцячага малюнка, дзе рэальнае пераплятаецца з фантастычным, дзе ўмоўныя маштабы неістотныя. Вялізны добры сабака, што нібы ляціць над горадам і трымае герояў на спіне, быццам сшытыя з рознакаляровых лапікаў тканіны дамкі, агромністыя яркія кветкі, амаль роўныя па вышыні з дрэвамі...

“Матэрыял мусіць цікавіць мастака, інакш праца пойдзе цяжка”, — упэўнены Дзмітрый Гаралевіч. Адданы аматар традыцыйнай культуры, ён вырашыў звярнуцца ў тэатры да нашага фальклору і прапанаваў рэжысёру Віктару Клімчуку зрабіць спектакль па матывах народнай казкі “Ох і залатая табакерка”. Як і было задумана, пастаноўка выявілася своеасаблівым беларускім сувенірам. Выразаныя з дрэва маскі і некаторыя лялькі, народныя строі, уплеценыя ў шырмы тканыя паясы, дзіўныя чаўны-маладзікі на задніку, някідкія фрагменты арнаменту — глядач нібыта адкрывае чароўны куфар са скарбамі мінулых часоў. Са сцэнаграфіяй спектакля “Ох і залатая табакерка” аўтар перамог у Рэспубліканскім конкурсе мастакоў тэатра і на правах трыумфатара сёлета зладзіў персанальную выставу ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

Спектакль "Ох і залатая табакерка"

Краявіды роднага Віцебска

ПРАФЕСІЙНЫ ПРЫМІТЫЎ

Захапленне народным мастацтвам адкрыла Дзмітрыю Гаралевічу дадатковую прастору для творчага выказвання. Ён вырабляе драўляныя скульптуры рэлігійнага зместу — увасобіў Распяцце (найбольш ранні і важны пластычны вобраз у афармленні храмаў), а таксама Хрыста ў вязніцы ноччу перад жорсткім пакараннем, дакладна перадаўшы ціхмянасць і адчуванне пакінутасці адначасова. Таксама мастак прапанаваў уласную трактоўку вобразаў апостала Пятра, архангела Міхаіла, святога Георгія Пераможцы, херувімаў, анёлаў. Заслугоўваюць увагі і шматфігурныя кампазіцыі на біблейскую тэматыку — ад поўнай спакою і ціхай радасці сцэны пакланення вешчуноў да пераследу Ірадам нявінных немаўлят. Дарэчы, нават далёкія ад выяўленчага мастацтва аматары фолка з творчасцю Дзмітрыя знаёмыя: фотаздымак батлейкі, якую зрабіў майстар, упрыгожыў калядны альбом “Месяц узышоў” сталічнага гурта Astroŭna.

У скульптуры творца імкнецца да лаканічнасці і абагульненых формаў, а для большай выразнасці выкарыстоўвае паліхромны роспіс у стрыманай гаме. Наследуючы стылю народных прымітываў, разьбяр наўмысна парушае прапорцыі. Падобна да майстроў-самавукаў мінулых часоў, даволі ўмоўна адпавядае канону і дадае ў аблічы нямала асабістага, душэўнага.

ФІЛАСОФІЯ НАЦЮРМОРТА

Усмешлівы летуценнік і аптыміст у тэатры, як жывапісец Дзмітрый Гаралевіч нярэдка паўстае маўкліва-задуменным, загадкавым і нават меланхалічным. У значнай часткі работ прыкметнае наследаванне ванітасу — алегарычнаму нацюрморту, які нагадвае пра хуткаплыннасць чалавечага існавання, марнасць зямных уцех і непазбежнасць смерці. На перайманне паказваюць звычайныя для паджанру, народжанага ў эпоху барока, атрыбуты. Да прыкладу, разбітыя пасудзіны розных формаў выступаюць сімвалам крохкасці жыцця. Нярэдка сасуды размешчаныя на хісткіх апорах з ламачча. Здаецца, толькі дыхні на дзіўныя канструкцыі — і яны абрынуцца, ператварыўшыся ў кучу смецця. Так аўтар надае рабоце асаблівы трывожна-насцярожаны настрой, даводзіць гледача да надзвычайнай эмацыйнай напружанасці. Аб недаўгавечнасці чалавека і няўхільным адыходзе кажуць таксама марскія ракавіны, а гадзіннікі наводзяць на думкі пра шалёна хуткі бег часу. Усе рэчы ў беспарадку, яны нагрувашчаныя або раскіданыя па пакоі. Нярэдка ў гэтым хаосе можна трапіць на старыя фотакарткі з абліччамі, верагодна, памерлых гаспадароў развернутых пажыткаў. Аб наследаванні старадаўнім майстрам кажа і гравюра Ганса Голбейна — малодшага з серыі “Скокі Смерці” на адным з нацюрмортаў. Але ў адрозненне ад творцаў мінулых стагоддзяў Дзмітрый Гаралевіч за рэдкім выключэннем адмаўляецца ад паказу чэрапа, некалі цэнтральнага атрыбута жанру, ад пышнасці і дэталізацыі выявы.

Вядома, не кожны нацюрморт заключае развагі пра хуткаплыннасць гадоў. У некаторых работах аўтар хутчэй імкнецца давесці, што неадушаўлёныя прадметы на самай справе жывыя. Мастак пільна даследуе форму, фактуру і колер рэчаў, прыглядаецца нават да самых дробных адбіткаў часу, каб аднавіць гісторыю артэфактаў. Прыцягнуць увагу творцы здольныя самыя непрыкметныя, здавалася б, аб’екты, такія як каменьчык ці сухая галінка. Што ў адборы натуры, што ў пастаноўцы нацюрморта жывапісец збольшага давярае інтуіцыі. Рацыянальна патлумачыць, чаму той ці іншы элемент не пасуе кампазіцыі, папросту немагчыма.

ЛІРЫКА З ЭЛЕМЕНТАМІ КРАЯЗНАЎСТВА

Гарадскія пейзажы Дзмітрыя Гаралевіча элегічныя, часам нават трывожныя. На палотнах паўстаюць куточкі роднага Віцебска. Аднак вы не пабачыце ў творах ратушу ці іншыя славутасці, бо мастака цікавяць не прыбраныя брукаваныя кварталы, а невядомыя турыстам мясцінкі са своеасаблівым характарам: ціхія вулкі і звычайныя дворыкі з крывымі агароджамі, гаспадарчымі пабудовамі, цаглянымі і драўлянымі дамкамі на адзін-два паверхі — нярэдка закінутымі, напаўразбуранымі. Некаторыя з гэтых аб’ектаў да цяперашняга часу, на жаль, не захаваліся.

Творца не вельмі ўтульна пачуваецца ў шматлюднасці, больш любіць пабыць у самоце. Мо таму ў яго гарадскіх краявідах чалавечыя постаці з’яўляюцца рэдка? Толькі часам можна напаткаць адзінокага мінака, які кудысьці брыдзе, ці позняга наведвальніка рэстаранчыка, што выйшаў на перакур.

Парадоксу ў тым, што Дзмітрый Гаралевіч можа быць і казачнікам-жыццялюбам, і меланхалічна-раздумлівым суцэзіральнікам, няма. У кожным відзе творчасці майстар карыстаецца рознай оптыкай для разгляду адных і тых жа тэм — маралі, памяці, месца асобы ў свеце.

Данііл ШЭЙКА
Фота з архіва мастака

Падчас здымак фільма "Дняпроўскі рубеж"

На майстар-класе ў БДУКМ

Мы помнім, Алёша...

Аляксей Дудараў і ўспаміны? Яшчэ ўчора гэта здавалася немагчымым. Бо вось жа майстар — жывы і актыўны. Ды вясна пачалася ўжо без яго, але з ягонымі творамі.

ВЯЧАСЛАЎ НІКІФАРАЎ,
заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кінарэжысёр, сцэнарыст, акцёр, педагог:

— Увесь гэты час, як даведаўся пра нечаканую смерць Дударава, у мяне ў галаве верціцца адно слова: ніколі. На жаль, я не зняў з ім ніводнага фільма, а вельмі марыў. Спачатку не склалася ў 1980-х, з "Белымі Росамі". Ён папрасіў мяне прачытаць сцэнарый, я ўжо пачаў фантазіраваць, што і як там можна зрабіць у плане здымак. І мы сутыкнуліся з Дударавым на лесвіцы "Беларусьфільма": я паціху ўзнімаўся, а ён хуценька спускаўся. Я ўзрадаваўся нечаканай сустрэчы: "Мы можам гэта зрабіць, і вельмі добра". А ён: "Позна, мы ўжо з Дабравольскім дамовіліся". Прычым сказаў гэта не са злараднай урачыстасцю (маўляў, хутчэй трэба было думаць-разважаць), а з прыкрасцю.

Потым, у 2002-м, замігцела цэля "Радавых". Ды не ажыцявілася. Памятаю, зайшоў неяк да аднаго тагачаснага кіраўніка, а ён штосьці ў тэксце выкрэслівае. Не зважаючы на мяне, выказвае сваю думку наконт прачытанага: "Ды я так левай нагой магу! Хіба ж гэта драматургія?" А потым аказалася, што тое быў сцэнарый "Радавых".

П'еса Дударава — шырока прызнаная, неаднойчы ўганараваная ўзнагародамі, а вось наконт кінасцэнарыя — пэўна, ніяк не маглі ўцяміць, што гэта зусім іншы погляд на вайну, новы, у чымсьці нечаканы. Але вельмі дудараўскі. І надзвычай беларускі. Справа не толькі ў вобразах-сімвалах (яблыня з яблыкамі, якая палае, ці дзіця), але і ва ўсім, што звязана ў Беларусі з войнамі. Адзін з салдат, той жа Бушцец, перажывае прагу помсты, счэпленую ў прагай перамогі. Тое раптам набывае вялікі дадатковы сэнс. Бушцец нечакана для сябе самога шэпча: "І не дай мне, Гасподзь, патрапіць у яго" — у нямецкага хлапчука-падлетка, які толькі што забіў сябра салдата. Праз гэта яскрава выяўлялася думка: мы становімся заадно з тымі, хто забівае. Бо, забіваючы жывое, чалавек забівае сябе самога. Ён пакутнік — праз любоў да людзей. Таму і ўзнікаюць войны, што чалавек не можа зразумець пакуты іншага. І сіла народа — у тых перажытых пакутах, назапашаных у многае войнаў. Усё гэта было адлюстравана ў Дударава! У ім заўсёды можна было адчуць высокую ноту, гэткі звон духу. А яшчэ гумар, іронію, пластычнасць думак.

Назаўжды сышоў не проста драматург — адзін са светачаў беларускай нацыянальнай культуры. Ён, а таксама Уладзімір Мулявін, Ігар Лучанок — гэта ўсё анёлы-ахоўнікі нацыі. Але ж як мала фільмаў знята па дудараўскіх вытоках! Пры ўсіх узнагародах ён аказаўся недаацэнены. Увесь час ідуць размовы пра недахоп сцэнарыяў — дык трэба было звярнуцца да Дударава, каб у Беларусі паўстаў кінематограф узроўню Кустурыцы. Бо рэпертуар трэба будаваць на пэўным чалавеку, а не на разрозненых ідэях. Ёсць таленавітая асоба — з ёй і трэба працаваць наўпрост. А пра талент Дударава дадам такую дробязь. Неяк у сярэдзіне мая да мяне прыехалі сябры з Мурманска, я павёз іх на Мінскае мора — і раптам пачаў сыпацца снег. Белай крупкай. Сябры толькі пасмяяліся: маўляў, мы ад зімы да вас збеглі, а яна зноў нас дагнала. Расказаў пра гэта Дудараву, а ён адразу запаліўся: снег у Дзень Перамогі — гэта ж сімвал аднаўлення, міру, чысціні і святла.

ВАЛЕРЫЙ АНІСЕНКА,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, рэжысёр, акцёр, педагог, літаратар, мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне:

— Існуе менш вядомая сторонка творчасці Дударава, і я яе закрану. Так, ён вялікі драматург, у яго ёсць цудоўныя апавяданні, казкі. А ці ведаеце вы яго варыянт "Рычарда III"? Гэты шэкспіраўскі тэкст упершыню загучаў па-беларуску, і зрабіў той пераклад Аляксей Дудараў па маёй просьбе да Эдынбургскага фестывалю. Патэлефанаваў мне ў 12 гадзін ночы, гаворыць: "Пасля такой працы адчуванне, што ў мяне рукі па локаць у крыві". І пачаў чытаць. Ён як ніхто адчуваў слова — дзейснае, насычанае падтэкстам. І той пераклад разгалінаваных, часам закручана-мудрагелістых шэкспіраўскіх разважанняў стаў падобны да сухога, худога цела. Акурат для сучаснасці, нічога залішняга! Сусветна вядомы прафесар Майкл Гірэн Тош потым папрасіў гэты тэкст, каб паказваць студэнтам, як трэба сёння працаваць з радкамі Шэкспіра. А мне замовілі "Макбета", які паказваўся ля сцен замка XI стагоддзя. Увогуле ж, на той час за ўсю паўвекавую гісторыю фестывалю гэта быў першы ўдзел у ім нашай краіны. І Дудараў двойчы ездзіў з намі ў Англію. У яго ж перакладзе ішоў калісьці "Гамлет" у Купалаўскім, які потым паказвалі ў Іспаніі. Міхаіл Пташук тады сказаў Аляксею Ануфрыевічу, маўляў, Шэкспір табе на карысць пойдзе. І сапраўды, пасля гэтага ў Дударава з'явіўся "Вітаўт", напісаны белым вершам.

А пазнаёміліся мы яшчэ тады, калі творца іграў у ТЮГу ў спектаклі "Экіпаж". Стаў у ТЮГу загадчыкам літчасткі, і на тую ж пасаду я запрашаў яго, калі арганізаваў тэатр "Вольная сцэна". Але Дудараў прызнаўся, што хоча займацца ўласна творчасцю — і сапраўды, стаў класікам у 35 гадоў: "Радавых" нават Георгій Таўстаногаў рабіў. П'есы ў драматурга розныя, але "Радавыя", "Вечар" — непересягнутыя шэдэўры.

Акрамя спектакляў "Не пакідай мяне" ў Віцебску і Маладзечне, дзве яго п'есы я ўвасабляў на радыё, Аляксей Ануфрыевіч нават сам удзельнічаў у адной з такіх пастановак. Сяргей Фядотаў замовіў у мяне дудараўскі "Вечар" у Пермі, я адразу прыдумаў музычнае атачэнне — народныя песні, выкананыя Таццянай Мархель. Бо ставіць Дударава — адно задавальненне.

З ім заўжды было лёгка, ён ніколі не гуляў у гэткую велічную асобу, да якой і наблізіцца страшна. Наадварот! Памятаю, я хацеў прыдбаць машыну, ды грошай не хапала. У каго пазычыць? Звярнуўся па параду да Дударава, а ён адразу палез у кішэню і выцягнуў скрутак. Я яму ў адказ распіску, бо сума немалая, а ён ажно пакрыўдзіўся: "Забяры! Мы павінны верыць адзін аднаму".

ВЯЧАСЛАЎ КУЗНЯЦОЎ,
заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, кампазітар, прафесар, загадчык кафедры аркестравага дырыжыравання і інструментоўкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі:

— З творчасцю Дударава я пазнаёміўся яшчэ студэнтам, калі паглядзеў у Купалаўскім "Радавых" на музыку Алега Янчанкі. Гэта была падзея! Бачыў і акцёрская работы Аляксея Ануфрыевіча — вельмі пераканаўчыя. Бы ніколі не думаў, што давядзецца супрацоўнічаць. Асабіста мы пазнаёміліся, калі шчыравалі над балетам "Вітаўт", што пастаўлены ў нашым Вялікім тэатры. Памятаю, сустрэліся ля другога корпуса Акадэміі музыкі непадалёк ад опернага, і я атрымаў першы варыянт лібрэта. Потым было яшчэ сем, бо мы шукалі і нарэшце знайшлі менавіта балетнае ўвасабленне гісторыі, адлюстраванай у п'есе Дударава.

Пазней здарыліся задумы паводле Багдановіча, але яны адсунуліся, бо Аляксей Ануфрыевіч прынёс арыгінальны сюжэт — "Знак Белабога". Тое была цалкам ініцыятыва драматурга, ён ажно зааў, калі ў яго з'явілася гэтая ідэя. І мы з балетмайстрам Юрыем Траянам, з якім на той час, акрамя "Вітаўта", паставілі яшчэ "Анастасію", вельмі зацікавіліся. Бо ўбачылі, што разам з гэтымі пастаноўкамі на старажытнагістарычную тэматыку можа атрымацца балетная трылогія. "Знак Белабога" — пра яшчэ больш даўнія, практычна дагістарычныя часы, варожасць між плямёнамі Белабога і Чарнабога, што жывуць на розных берагах адной ракі. І пра каханне, што ўзнікае паміж дзяўчынай і юнаком з варожых лагераў — гэткімі беларускімі Рамэа і Джульетай першабытна-язычніцкіх часоў. Усе героі выпісаны вельмі эмацыйна, цікава. Таму пайшло ліставанне, доўгія тэлефонныя размовы, сустрэчы. Я напісаў музыку і паказваў яе ў кабінеце Дударава ў Саюзе тэатральных дзеячаў, які Аляксей Ануфрыевіч узначальваў з 1992 года.

На жаль, балет застаўся толькі на паперы, ён не быў рэалізаваны на сцэне. Як, дарэчы, і ранейшы мюзікл Эдуарда Зарыцкага "Белыя Росы", напісаны па заказе нашага Музычнага тэатра. Творы "па Дударове" трэба паставіць — яшчэ і як памяць пра гэтага выдатнага творцу. Пакуль жа — я бераўліва захоўваю дзве падораныя драматургам кнігі з яго аўтографамі: зборнік апавяданняў і п'есы. Захоўваю, бы часцінку самога аўтара.

АЛЯКСАНДР КОЗАК,
заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, рэжысёр Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, дырэктар Міжнароднага тэатральнага фестывалю "Белая вежа":

— Разам з Дударавым сышла цэлая эпоха беларускага тэатра. Але яшчэ больш балюча, што я страціў самага блізкага і надзейнага сябра, з якім заўжды можна было параіцца, які ніколі не адмаўляў у дапамозе. Мы вельмі даражылі гэтым сяброўствам, і зараз мне вельмі шкада, што пад пандэмію сталі апошнім часам менш сустракацца асабіста.

Я ганаруся, што іграў у п'есе Аляксея Ануфрыевіча "Парог". Што паставіў такія спектаклі, як "Вечар" (ужо другі дзясятак гадоў ідзе ў нашым тэатры), "Не пакідай мяне", паказаны і прызнаны ў многіх гарадах. Драматург не любіў умешвацца ў творчы працэс, але мы падштурхвалі адзін аднаго да таго, каб дабіцца дасканаласці. Нават спрачаліся, бо я дазваляў сабе (о жах!) штосьці змяняць у дудараўскім тэксце. Аўтар, вядома, часам быў незадаволены. Але здаралася, потым пагаджаўся.

Было шмат сумесных планаў, Аляксей Ануфрыевіч задумаў некалькі новых п'ес. Цяпер ідэі ўжо не здзейсняцца. Але мы вельмі ўдзячныя яму за ўсё, што ён зрабіў для тэатра. Не толькі для нашага — для развіцця тэатральнага мастацтва ўвогуле. І будзем захоўваць п'есы Дударава ў рэпертуары: яны не старэюць, бо гэта класіка. Жывая і надзвычай актуальная.

РЫГОР БЕЛАЦАРКОЎСКІ,
народны артыст Беларусі, акцёр Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра:

— Нас звязвала даўняе знаёмства — яшчэ з тых часоў, калі я працаваў у Брэсце. Памятаю, прыйшоў рэжысёр Саша Дольнікаў (а яны з Дударавым былі сябрукамі яшчэ з тэатральна-мастацкага інстытута) і прынёс рукапіс п'есы "Парог". Тая ставілася ў нас адначасова з тэатрам Янкі Купалы: у Мінску Буслая іграў Генадзь Гарбук, а ў Брэсце — я. Потым, ужо ў Магілёве, быў спектакль "Люсі + Капітан", дзе я выконваў ролю Капітана. А "Вечар", дзе я іграў дзеда Мульціка, нават вазілі ў Маскву, у якой мяне адзначылі за найлепшую мужчынскую ролю.

Іграць у п'есах Дударава — сапраўднае шчасце. Аляксей Ануфрыевіч не толькі меў драматургічную жылку, але і добра ведаў прыроду тэатра, быў вытбітным знаўцам чалавечай псіхалогіі, маляваў простых людзей — без аніякіх прыкрас. І ў сваіх творах даваў акцёрам магчымасць выявіць сябе, выкласці ўсё самае патаемнае.

Падчас наведвання Ігара Лучанка ў бальніцы

ВЕРАНІКА ВІНЕЛ,
дырэктар Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча (Бабруйск):

— Фільм "Белыя Росы" я ўбачыла яшчэ ў дзяцінстве, з таго часу ён застаецца маім улюбёным. У 2009 годзе адна з бабруйскіх газет праводзіла бліц-апытанку, і я, ніколькі не задумваючыся, зноў назвала гэтую стужку найлепшай і самай любімай. Калі расказала пра гэта Дударову, ён падарыў мне друкаваны асобнік сцэнарыя са сваім аўтографам. А пазнаёміліся мы на Рэспубліканскім фестывалі нацыянальнай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, што па традыцыі ладзіцца ў нашым тэатры. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце і статусе, размаўлялі на роўных. Так дэмакратычна ён паводзіў сябе з усімі. У рамках леташняга форуму, што адбыўся ў лістападзе, мы арганізавалі творчую сустрэчу з Дударавым у нашай славянскай гімназіі. Трэба было бачыць, як гэта зацікавіла, прыцягнула моладзь, колькі пытанняў яму задавалі, з якім бляскам у вачах падыходзілі і пасля афіцыйнага завяршэння імпрэзы. Ніхто тады не мог падумаць, што тая наша сустрэча была апошняй. І што навучэнцы, якія на яе прыйшлі, сталі сведкамі папраўдзе гістарычнай падзеі. Бо менавіта так успрымаецца сёння ўсё звязанае з Аляксеем Ануфрыевічам. Прынамсі, падобныя сустрэчы праходзілі не толькі ў нас. Ведаю, што, калі Мінскі абласны драматычны тэатр святкаваў юбілей, Дударай таксама правёў творчую сустрэчу з навучэнцамі маладзечанскага каледжа мастацтваў — з не меншым поспехам, стаўшы ледзь не кумірам для падлеткаў.

Ды ўсё ж асаблівы гонар я адчуваю таму, што менавіта Дударай як старшыня Саюза тэатральных дзеячаў уручыў мне прыз "Натхненне", ацаніўшы арганізацыйную дзейнасць нашага тэатра. Ды ўвогуле, ён бачыў у кожным тое, чаго не заўважалі іншыя. І акцэнтаваў менавіта найлепшыя якасці, змушаючы атачэнне чалавека адпавядаць такім, хай і завышаным, характарыстыкам. Прычым рабіў гэта вельмі шчыра, з запраўднай цеплынёй і лёгкасцю, што адразу выклікала асаблівы давер. Між іншым, тое цудоўны псіхалагічны прыём, які дапамагае ўсім нам стаць лепш.

ВАЛЕРЫЯ ВІЗГАВА,
дырэктар Калужскага абласнога ТЮГа (Расія):

— Калі мы сабраліся ставіць п'есу "Не пакідай мяне" (а раней, дарэчы, у нас ішоў дудараўскі "Парог"), я патэлефанавала ў Саюз тэатральных дзеячаў Беларусі, пачаліся перамовы. Потым напісала Дударову, бо вельмі ж хацелася, каб ён прыехаў на прэм'еру. Уяўляла мудрага, мяркуючы па п'есах, старога, які ўсё піша і піша, нават часу не мае на людзях паказвацца. А ўбачыла яго ў Бабруйску на фестывалі нацыянальнай драматургіі і вельмі здзівілася: выглядае надзвычай моладa, унутранай энергіі — не займаць.

Спектакль "Не пакідай мяне" выйшаў у 2013-м і ўжо без малога 10 гадоў упрыгожвае наш рэпертуар. За гэты час пастаноўку паглядзелі больш як 13 тыс. чалавек. За адзін толькі люты мы сыгралі яе пяць разоў! Пры паўнюткіх залах. З кожным паказам спектакль становіцца быццам усё больш насычаным, раскрывае нас самі, у тым ліку — маладых, бо хлопцы і дзяўчаты 14—22 гадоў актыўна ходзяць у ТЮГ па "Пушкінскай карце". А як глядзяць гэтую пастаноўку ветэраны! Не вераць, што драматург не бачыў вайны на свае вочы, спасцігаў яе найперш праз аповеды бацькі. Я кожны спектакль пачынаю ўступным словам, абавязкова называю аўтара, быццам ён сядзіць у зале.

Даведаўшыся пра заўчасную смерць Аляксея Ануфрыевіча, мы змясцілі пост на нашым сайце, вырашылі правесці вечарыну памяці. Але ж такое адчуванне, нібыта творца ўсё роўна жывы, ён з намі, вось яго плячо! Мы вельмі шчаслівыя, што давялося пазнаёміцца з Дударавым асабіста, што літаратар бачыў нашу пастаноўку, калі мы паказвалі яе ў Бабруйску, і нават выйшаў з намі на паклон. Аляксей Ануфрыевіч і сапраўды застанецца жывым, пакуль ідуць яго спектаклі.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Рэпартажныя фота Юрыя ІВАНОВА

СТРАТА

Віцебскі абласны выканаўчы камітэт і Віцебскі абласны Савет дэпутатаў выказваюць спачуванні родным і блізкім **Аляксея Ануфрыевіча Дударава**, таленавітага беларускага драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР. Памяць пра майстра назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Дубровенскі раённы выканаўчы камітэт смуткуе з прычыны рантоўнай смерці земляка – **Аляксея Ануфрыевіча Дударава**, беларускага драматурга, сцэнарыста, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР. У нашай памяці творца назаўсёды застанецца сынам Дубровеншчыны, яе гордасцю і славай.

Глыбока ўзрушаны паведамленнем пра смерць **Аляксея Ануфрыевіча Дударава**.

Аляксей Ануфрыевіч быў вядомым беларускім драматургам, сцэнарыстам, аўтарскі талент Аляксея Ануфрыевіча рэалізаваўся ў айчынным кіно. Па сцэнарыях творцы зняты такія фільмы, як "Восеньскія сны", "Брэсцкая крэпасць", серыял "Не пакідай мяне", а таксама незабыўныя і самыя любімыя "Белыя Росы". Аляксей Ануфрыевіч зяўляўся заслужаным дзеячам мастацтваў Беларускай ССР, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, старшынёй Беларускага саюза тэатральных дзеячаў.

Аляксей Ануфрыевіч быў прафесіяналам свайёй справы, духоўным і шчырым, глыбокім і прыстойным чалавекам. Мы высока цэнім значны ўклад Аляксея Ануфрыевіча ў развіццё нацыянальнага кінамастацтва. Здарылася незаменная страта для нашага грамадства.

Падзяляем горыч і душэўны боль, выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім Аляксея Ануфрыевіча, яго калегам і сябрам, глыбока смуткуем з прычыны незаменнай страты.

Калектыў УП "Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»"

Пайшоў з жыцця **Аляксей Ануфрыевіч Дударай**, беларускі драматург, сцэнарыст, педагог, акцёр, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР, старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў...

Немагчыма ўявіць сучасную драматургію без яго імя. Спектаклі, пастаўленыя паводле п'ес Аляксея Ануфрыевіча, – упрыгажэнне рэпертуару многіх драматычных тэатраў Беларусі. Гледачы ніколі не заставаліся абыякавымі да "простых гісторый" Дударава, бо ў цэнтры кожнай быў чалавек – жывы, сапраўдны, наш сучаснік, які апынаўся перад выбарам, што ставілі перад ім Час і Лёс. Як часта можна было ўбачыць людзей, якія пасля спектакля па творах Дударава выходзілі са слязьмі на вачах – ці не гэта найвышэйшая ацэнка таленту...

Многія запомняць Аляксея Дударава як аднаго са стваральнікаў знакамітага фільма "Белыя Росы". Для іншых імя драматурга непадзельна звязана з тэмай Вялікай Айчыннай вайны і легендарнымі "Радавымі". На працягу ўсёй творчай дзейнасці Дударава цікавіла і тэма далёкай мінуўшчыны. Дзякуючы яго таленту, на сцэне Вялікага тэатра Беларусі ажыла гісторыя пра легендарнага князя Вітаўта – менавіта п'еса Аляксея Ануфрыевіча стала асновай балета "Вітаўт"...

Аляксей Дударай быў сябрам і частым гледачом Вялікага тэатра Беларусі, парады і крытыка літаратара заўсёды з яўляліся стымулам да таго, каб удасканальвацца, а пахвала – бясцэнная.

Калектыў Вялікага тэатра Беларусі смуткуе ў сувязі са смерцю сапраўднага Чалавека і Майстра і выказвае шчырыя спачуванні родным, блізкім, сябрам і калегам.

Калектыў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР, лаўрэата прэміі Саюзнай дзяржавы, старшыні Беларускага саюза тэатральных дзеячаў **Дударава Аляксея Ануфрыевіча** ў сувязі са смерцю драматурга.

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: vitebsk-fil.by

• Канцэрт **"Сэрца на снезе" (6+)** — выступленне трох барытонаў да Міжнароднага дня жанчын. **6 сакавіка а 19.00.**
• Канцэрт **"Музыкатэрапія. Натхненне" (6+)** — класічная музыка з эрапеўтычным эфектам. **7 сакавіка а 19.00.**
• Імпрэза, прысвечаная Клаўдзіі Шульжэнка **(6+)** у межах цыкла лекцый-канцэртаў Ad libitum. **9 сакавіка а 19.00.**
• Музыкальна-паэтычны вечар **"Скажы мне што-небудзь добрае" (6+)** на вершы Р. Раждзественскага. **11 сакавіка а 19.00.**
• Прадстаўленне **"Гісторыі ката Філафея" (3+)** у межах праекта "Філармонія — дзецям". **12 сакавіка аб 11.00.**

УНП 300149385

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• **Modern Culture View Fashion Week (0+).** Галоўная сцэна. **4 сакавіка а 13.30, а 19.30.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+).** Прэм'ера. Галоўная сцэна. **5 сакавіка а 19.00.**
• Прадстаўленне **"Музыка душы" (0+).** Камінная зала. **7 сакавіка а 19.00.**
• Трагіфарс **"Donna sola (Жанчына адна)" (18+).** Камерная сцэна. **7 сакавіка а 19.00.**
• Містычная легенда пра каханне ў 1 дзеі **"Чорная панна Нясвіжа" (12+).** Галоўная сцэна. **9 сакавіка а 19.00.**
• Камедыя ў 2 дзеях **"Паўлінка" (12+). Галоўная сцэна. 10 сакавіка а 19.00.**
• Звычайная гісторыя **"Час жыцця" (12+).** Галоўная сцэна. **11 сакавіка а 19.00.**

УНП 100377901

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, д. 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Імправізацыя ў 2 дзеях **"Казкі пра казку" (6+). 4 сакавіка аб 11.00.**
• Гісторыя незвычайнага сяброўства ў 2 дзеях **"Насарог і Жырафа" (4+). 5 сакавіка аб 11.00.**
• Казка-прыпавесць у 1 дзею **"Кацёл з каменьчыкамі" (7+).** Прэм'ера. **11 сакавіка аб 11.00.**

УНП 300001869

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выстава **"Арт-сезоны з «Гекльберы»"**, прымеркаваная да Года міру і стварэння. **Да 2 красавіка.**
• Экспазіцыя **"Жаночы род". Да 28 мая.**
• Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**
Падрабязней на сайце artmuseum.by альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава Марыны Капілавай **"Пункт гледжання". Да 3 сакавіка.**
• Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Сядзібны партрэт".** Папярэдні запіс.

Праводзіцца заўсёды.
• Спектакль тэатра ценяў **"Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Белая сарока".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819.**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Персанальная выстава Мікалая Аўчыннікава **"Прыцяжэнне"**, прымеркаваная да 70-годдзя з дня нараджэння мастака. У экспазіцыі — каля 40 твораў з майстэрні аўтара. **Да 5 сакавіка.**
• Выстава скульптуры і графікі Аляксандра Фінскага, прымеркаваная да 70-годдзя з дня нараджэння творцы. **Да 5 сакавіка.**
• Выстава **"Плады Зямлі"**, прысвечаная Году міру і стварэння. **Да 5 сакавіка.**
• Выстава **"Беларусь — Кітай. Супрацоўніцтва і сяброўства". Да 12 сакавіка.**
• Рэтраспектыўная выстава **"Валерый Шкаруба. In Memoriam". Да 26 сакавіка.**
• Выставачны праект **"Леанід Шчамлёў. Да 100-годдзя з дня нараджэння". Да 2 красавіка.**
• Фотавыстава **"Музыка душы — спадчына"**, прысвечаная 90-годдзю Беларускага саюза кампазітараў. **Да 2 красавіка.**
• Экспазіцыйны праект **"Вобраз Радзімы ў творах беларускіх мастакоў XVIII—XXI стст.".** Выставачны корпус. **Да 23 красавіка.**
• Заняткі курса **"Філасофія з дзецьмі ў Мастацкім" (наведвальнікі ад 7 да 10 гадоў). Да 9 сакавіка.**
• Экскурсіі: **"Якога колеру зіма?" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Пяць моў кахання" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Канцэртная праграма **"Музычнае свята ў палацы".** Тэатральная зала. **8 сакавіка а 14.00.**
• Экспазіцыя сучасных мастачак Марыны Канавалавай і Алы Шкарадзёнак **"Выпадковае".** Вялікая выставачная зала. **Да 18 красавіка.**
• Выстава **"Недзеепрыметны зварот".** Часовая экспазіцыя аўтарскіх лялек, прысвечаных пісьменнікам і паэтам XIX—XX стагоддзяў, ад сяброў Міжнароднай гільдыі майстроў (Санкт-Пецярбург). Малая выставачная зала. **Да 28 мая.**
• Выставачны праект **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны".** У экспазіцыйнай зале першага пускавога комплексу.
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара".** У складзе пастаяннай экспазіцыі.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Палацавыя таямніцы", "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры",** экспазіцыя Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі".**
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Персанальная выстава твораў мастачкі Аліны Бароўскай **"Карункі мінулага". Да 26 красавіка.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стст. **"Культура часу".** З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў Ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (група да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён,
тэл.: 8 017 5074468

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Праграма **"Каляды ў музеі". Праводзіцца заўсёды.**

Працягласць — 2—2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы.

УНП 100377771

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі раён,
Гродзенская вобласць,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Канцэрт **"Музыка вясны"** таленавітага піяніста, саліста Белдзяржфілармоніі, выкладчыка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэата міжнародных конкурсаў Аляксандра Музыкантава. Партрэтная зала. **8 сакавіка з 11.00 да 13.00.**
• Выстава **"ARMATUS. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі" (0+).** Паўночны корпус. **Да 31 жніўня.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

УНП 590201541

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая выстава **"Памяць народа святая"** — сумесны праект Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь, агенцтва "Узархіў" Рэспублікі Узбекістан. **Да 5 красавіка.**
• Часовая экспазіцыя **"Мастакі пра вайну".** Аснову праекта складаюць 25 жывапісных палотнаў з фондаў музея. **Да 15 сакавіка.**
• Выстава **"Вызваленне Еўропы"** ў рамках міжнароднага праекта **"Тэрыторыя Перамогі"**, які абядноўвае 250 музеяў і ваенна-гістарычных цэнтраў Расіі і іншых краін.
• Часовая экспазіцыя **"Вызваленне Беларусі. Верасень 1943 — ліпень 1944 гг."** у філіяле музея — ВГК "Старая мяжа".
• Анлайн-выстава **"Трагедыя народаў".**
• Часовая экспазіцыя **"У баях за Айчыну. Дзейнасць спецгруп НКУС — НКДБ СССР — БССР на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1944 гг."** у філіяле музея — ВГК "Старая мяжа".

У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне музея з экскурсіяй і без яе. Даступныя абанементы: "Сямейны", "Дзіцячы", "Для дарослых і старшакласнікаў". Падрабязнасці на сайце warmuseum.by.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **"Штучны інтэлект: мастак ці машына?". Да 26 сакавіка.**

г. Мінск, вул. Някрасава, 3, тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля з 12.00 да 20.00

• Выстава **"Плюс/мінус 100: народныя мастакі-юбіляры". Да 19 сакавіка.**
• Выстава **"Джаз! Каты! Вясна!". Да 26 сакавіка.**

УНП 192543414

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага саставу:

– выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дызайну;
– загадчык кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання;
– дацэнт кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара БДАМ на адрас: **220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81.**

Аддзел кадраў, тэлефон: **8 017 3669341.**

Інфармацыю пра наяўнасць газеты ў кіёсках "Белсаюздрука" ў Мінску можна атрымаць па тэлефоне 8 017 2764542 з 9.00 да 17.00.

З пытаннямі размяшчэння рэкламы звяртайцеся па тэлефоне **8 017 2860797** або на электронную пошту **reklama@kultura-info.by.**

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)

Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.

Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Яўген РАГІН.

Аглядальнікі рэдакцыі: Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Літаратурны рэдактар — Мацвей ЗАЙЦАЎ.

Мастацкі рэдактар — Марына ПЯРКОЎСКАЯ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: 8 017 2860797, 8 017 3345723.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

* — матэрыял на правах рэкламы.
© "Культура", 2023.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879. Ільготныя на паўгодзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %). Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %). Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 03.03.2023 а 18.00. Замова № 513. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Наклад 3020.